№ 33 (343) 12 верасьня 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Тэма тыдня:

## Газавая ломка

Прычыны чарговай расейскай газавай атакі на Беларусь лягчэй камэнтаваць, калі аналізаваць яе магчымыя наступствы. Якія, у сваю чаргу, спрагназаваць даволі проста, калі ўзяць пад увагу цяперашні стан беларускай эканомікі. Цяжка пагадзіцца з тымі, хто канстатуе яе ўздым, але і пра відавочны каляпс казаць ніяк нельга.

Некаторыя паказчыкі сьведчаць нават пра папраўку эканомікі. Напрыклад, імклівы рост цэнаў на жытло ня можа адбывацца бяз росту пакупніцкай здольнасьці насельніцтва (некаторыя запярэчаць, што ніякага росту і не было: у пераліку на эўра квадратны мэтар менскай жылплошчы каштуе столькі ж, колькі і каштаваў два гады таму).

Працяг на старонцы 4.

# Усход перад Захадам



Фотарэпартаж Сяргея Грыца з Іраку. Старонка 6.




ПАЛІТЫКА

## Няясны пераварот у своеасаблівай партыі

Чуткі, што 6 верасьня можа адбыцца раскол ЛДП, зьявіліся напярэдадні зьезду. Першую паразу Сяргей Гайдукевіч пацярпеў на выбарах сакратара зьезду. Большасьць дэлегатаў прагаласавалі за кандыдатуру першага намесьніка старшыні Аляксандра Рабатая. Потым іншы намесьнік, Алег Маркевіч, зьвінавconfigurableціў Гайдукевіча ў аўтарытарных мэтадах кіраваньня, маргіналізацыі партыі, карупцыі і г.д. Страціўшы кантроль за ходам зьезду, Гайдукевіч сышоў з залі і заклікаў прыхільнікаў пайсьці разам зь ім. Апанэнты Гайдукевіча даводзяць, што большасьць засталася на зьезьдзе. З кім пайшла большасьць, на працягу месяца павінен вырашыць Мінюст.

Рэшта дэлегатаў унесла зьмены ў статут партыі, зьняла з пасады старшыні Гайдукевіча, выбрала Вышэйшую раду зь пяці чалавек — Алега Маркевіча, Аляксандра Рабатая, Андрэя Курса, Віталя Прышчэпава (старшыня Віцебскай абласной арганізацыі) і Сяргея Талка (кіраўнік Бабруйскай арганізацыі). Да сакавіка 2004-га зьезд перадаў Вышэйшай радзе свае паўнамоцтвы. Усе гэтыя эпахальныя зьмены былі ажыцьцёўленыя за паўгадзіны, што заставаліся да сканчэньня тэрміну арэнды памяшканьня.

Гайдукевіч у панядзелак раніцай адправіўся ў Мінюст, куды прыхапіў з сабой пячатку і рэгістрацыйныя дакумэнты партыі. Туды ж паехаў і прадстаўнік новага кіраўніцтва Аляксандар Рабатай. Офіс на вул. Платонава, 22 кантралявалі апанэнты Гайдукевіча. Сытуацыя там была нэрвовая: хтосьці распусьціў чуткі, што магчымы сілавы захоп офісу. На сьценах яшчэ віселі партрэты Гайдукевіча. «Зьняць не пасьпелі», — тлумачыў Маркевіч.

Аднак Гайдукевіч у панядзелак у офіс гэтак і не прыехаў, патлумачыўшы сваю «нядоўгую адсутнасьць» днём народзінаў.

Працяг на старонцы 2.

## Спрэчка Ведзьмакоў

**Разгадка таямніцы аўтарства «Сказу пра Лысую гару» — галоўная культурная інтрыга апошніх тыдняў. У аўтарстве прызнаўся Ніл Гілевіч. Аднак літаральна праз тыдзень пасьля гэтага выступіў абураны Мікола Аўрамчык: «Гілевіч ня сам пісаў паэму, мы пісалі яе ўдвух. Ён ня мае права прыватызаваць гэты твор».**

**«Толькі апошні глухі літаратурны цецярук можа сумнявацца ў тым, хто напісаў гэтую паэму. А даваць камэнтары я ня буду: усё, што хацеў сказаць, я напісаў у артыкуле», — адказаў карэспандэнту «НН» Ніл Гілевіч. Мікола Аўрамчык стаіць на сваім: у паэмы два суаўтары. Прычым пра паэму ён невысокае думкі: «Гэта звычайны, хахмічны, грубаваты твор. Я пра гэтую паэму нікалі не сказаў бы «Здорава», як піша Гілевіч, — яна звычайная».**

**Старонка 7.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Мікола Аўрамчык: у «Сказу пра Лысую Гару» два суаўтары**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Хранічны насмарк у часы глёбкі



Навіна пра тое, што расейцы, незадаволеныя выбрыкамі бацькі, зьбіраюцца ўзьняць цэны на энэрганосьбіты, прыемна ўзрадавала. Беларусам зноў пашчасьціла. Таксай за ўваход у вольны капіталістычны рынак будзе ўсяго некалькі тысячаў адмарожаных членаў і хранічны насмарк — наступствы перабояў з гарачай вадой у наступную зіму. Гэта, паверце мне, дробязь. Кітайцаў, якія не хацелі адчыняць гавані іншаземцам, абстрэльвалі з карабельных гарматаў і падсаджвалі на опіюмную шырку, бэнгальцаў — канкурэнтаў брытанскіх тэкстыльшчыкаў — марылі голадам, а арабаў, якія нацыяналізавалі Суэцкі канал, фугасілі бомбамі.

Асабістым псыхалягічным фактарам беларускай школы выжываньня ў рынкавых умовах стане душэўны патрыятычны жар. Аргумэнтуючы сваю палітыку, Лукашэнка пачне «юзаць» ідэю незалежнасьці, чым зноў загоніць правую і левую апазыцыю ў стан крызысу жанру.

Правым апазыцыянэрам — лёгка. Будуць і далей бубніць сваю мантру пра добрага цывілізаванага інвэстара з Захаду з сацыяльна адказнай этыкай. Тое, што адзін зь іх — нямецкая кампанія — плянаваў узьвесьці ў Курапатах жылы комплекс, іх не пераканае. Як і тое, што гістарычна першымі інвэстарамі на пэрыфэрыі заўсёды былі экс-калянізатары. У былых афрыканскіх францускіх калёніях вяршкі з прыроднай рэнты здымае «Elf», у брытанскіх — «British Petroleum» і г.д. Увесь сьвет такім чынам і прыйшоў да рынку.

Для шматлікіх левых нацыянал-папулізм куды прывабнейшы за дыктат замежных манаполій. У Конга-Кіншаса, па тэрыторыі прыблізна роўным Эўразьвязу, напярэдадні вызваленьня ад бэльгійцаў было ўсяго дзевяць тубыльцаў з вышэйшай адукацыяй. Падчас праўленьня мясцовага князька Мабуту Сэсэ Сэка, які раскраў краіну ўшчэнт, па басэйне ракі Конга бадзяліся ўжо сотні тысяч чарнаскурых з «ВНУшнымі корачкамі».

Сёньня левыя павінны вызнаць, што ў часы глёбкі (глябалізацыі) патэрналісцка-дзяржаўны капіталізм не зьяўляецца прэзэрватывам ад вірусу бюджэтнага дэфіцыту на сацыяльныя праграмы. Рэжым Лукашэнкі ўсё ж падпарадкаваны траекторыі мадэлі «разьвіцьця наўздагон». Як сьведчыць досьвед краінаў з пратэкцыяністцкім тыпам кіраваньня — Бірмы, Кітаю, — усё скончыцца банальна: мандарыны будуць ціха прадаваць дзяржмаёмасьць.

Дый нацыяналізм а-ля Лукашэнка — гэта набор экспанатаў строчыцкага музэю культуры, «Саўка ды Грышка дзелалі дуду», Купала і кінахалтура «Настасься Слуцкая».

Левы нацыянальны праект — гэта форма зьняцьця адчужэньня, вяртаньне асобе пачуцьця творцы гісторыі, культуры і гаспадара грамадзтва. Адваротным бокам архаізацыі культурнай традыцыі зьяўляецца кансэрвацыя думкі і правінцыялізацыя.

Адносіны адчужэньня характэрныя як для лукашэнкаўскай, так і для фрытрэйдэрскай мадэляў.

Маю надзею, што правакацыі беларускіх левых будуць падпарадкаваныя ідэі пошуку альтэрнатывы адчужэньню і эмансыпацыі асобы, а не «антыімпэрыялістычнаму партнэрству» і фармальнай апазыцыі.

Прывітаньне Севярынцу.

**Лёлік Ушкін**

ПРАВЫМ ВОКАМ

# Супрацьгаз для Беларусі



IREX-PROMEDIA

Крэмль слова ў слова паўтарыў знакамітую цытату з савецкае кінаклясыкі: «Калі ня будуць браць — адключым газ». Газ для Расеі даўно стаў вырашальным інструмэнтам геапалітыкі і апошнім аргумэнтам для суседзяў, на якіх Масква глядзіць праз прыцэл газавае трубы.

Рубель, канстытуцыйны акт, нафтахімія, «трэці тэрмін», вынікі выбараў у Думу, «Белтрансгаз» выстаўленыя на кон. За апошнія гады — максымальныя стаўкі.

Найлепшым выйсьцем для Лукашэнкі ў гэтай сытуацыі было б проста дастаць з кішэні грошы й заплаціць Расеі за газ — па сусьветных цэнах. Незалежнікі пляскалі б у ладкі, а Крэмль пазбаўляўся б галоўнага рычагу ўціску. Праўда, лёгіка паводзінаў рэжыму падказвае, што гульня працягнецца. Нас чакае чарговы абмен уколамі, блеф, гандаль і разьлік на баявую нічыю да «выбараў Пуціна».

І ўсё-такі сёньняшнія газавыя спазмы — ідэальная мадэль для распрацоўкі стратэгіі нацыянальнага руху ў дачыненьнях з Расеяй. Новаму кіраўніцтву Беларусі давядзецца сутыкнуцца з ультыматумам «Газпрому» ў самы вырашальны для незалежнасьці момант. Таму трэба быць гатовым:

— даць жорсткі адпор Крамлю і паказаць народу «сапраўднае аблічча расейскага імпэрыялізму»;

— плаціць за газ па 50 і нават 60 даляраў за тысячу кубамэтраў;

— узяць на Захадзе буйны крэдыт на рэструктурызацыю электраэнэргетыкі;

— шукаць альтэрнатыўныя крыніцы вуглевадародаў;

— на некалькі месяцаў увесьці ў краіне рэжым строгае эканоміі цяпла ды сьвятла.

Пэўны час будзе як у супрацьгазе: цёмна, вусьцішна і ўсе навокал палохаюцца. Але некалькі ўздыхаў зь цяжкім сапеньнем — гэта не такі ўжо й высокі тарыф, калі ідзецца пра нацыянальную годнасьць, жыцьцё і свабоду.

**Павал Севярынец**

# Няясны

Працяг са старонкі 1.

А ўжо ў аўторак апанэнты адначасова працавалі ў партыйным офісе, чакаючы рашэньня Мінюсту.

Пры Гайдукевічу за ЛДП замацаваўся імідж партыі, дзейнасьцю якой дырыгуюць улады і якая адлюстроўвае інтарэсы «шэрага» капіталу. Асабліва запомнілася, як Гайдукевіч выкарыстоўваў прэзыдэнцкую кампанію 2001 г. для дыскрэдытацыі Ўладзімера Ганчарыка. Палітоляг **Уладзімер Мацкевіч** скептычна выказваецца наконт ЛДП: «Гэта цалкам разьдзьмутая структура, бурбалка. Мэты яе ніколі не былі палітычнымі». **Аляксандар Рабатай** прызнае, што пры Гайдукевічу партыя ўяўляла сабой «сукупнасьць мноства структураў пад адной назвай і пры адсутнасьці ідэалягічных арыенціраў».

Што ўяўляюць сабой новыя кіраўнікі ЛДП? **Аляксею Курсу** 30 гадоў, ён мянчук. Паводле адукацыі — настаўнік біялёгіі і хіміі. Скончыў пэдунівэрсытэт, вучыўся там у асьпірантуры, а цяпер працуе выкладчыкам. Рыхтуе да абароны кандыдацкую дысэртацыю.

**Алегу Маркевічу** 39 гадоў, нарадзіўся ў Менску. Паводле адукацыі юрыст, скончыў Беларускі інстытут правазнаўства. Цяпер вучыцца ў асьпірантуры, працуе над кандыдацкай дысэртацыяй. У палітыку ён прыйшоў з камэрцыйных структураў. Маркевіч — адзін з заснавальнікаў ЛДП, займаў пасады сябра Вышэйшай рады і кіраўніка яе апарату, намесьніка старшыні партыі.

**Аляксандру Рабатаю** 49 гадоў, ён нарадзіўся ў Заходняй Украіне. Скончыў Сьвярдлоўскую вышэйшую вайскова-палітычную вучэльню, вайскова-палітычную акадэмію імя Леніна ў Маскве (філязофскае аддзяленьне). З 1977 г. жыве ў Беларусі, выкладае ў Вайсковай акадэміі. У Маскве вучыўся разам зь Сяргеем Юшанковым, кажа, што сябравалі. Пасьля развалу СССР знайшоў сябе ў палітыцы, уваходзіў у прарасейскі Народны рух Беларусі, а пасьля ўступіў у Лібэральна-дэмакратычную партыю, быў адным з аўтараў яе праграмы. Захапляецца Напалеонам і яго эпохай, зьбірае зьвесткі пра сваіх продкаў, якія ваявалі ў складзе корпусу Панятоўскага супраць расейскіх войскаў.

**Віталь Прышчэпаў** — таксама афіцэр у адстаўцы. **Сяргей Талок** калісьці ўзначальваў прыватную тэлерадыёкампанію ў Бабруйску. Пасьля яе ліквідацыі і канфіскацыі маёмасьці пайшоў у палітыку.

# Партыя траянскіх дэмакратаў

Сама Лібэральна-дэмакратычная партыя палітычных аглядальнікаў мала цікавіла з прычыны нізкае папулярнасьці і несамастойнасьці. Раскол у партыі вонкава нагадвае расколы ў шэрагах «клюбных партый». Аднак застаецца пытаньне: хто стаіць за раскольнікамі? Тое, што Алег Маркевіч і іншыя дыстанцыяnaваліся ад Гайдукевіча, яшчэ ні пра што ня кажа. Раскол мог быць інсьпіраваны звонку. Магчыма, з ЛДП выдаляецца адыграная фігура, а сутнасьць партыі застаецца нязьменнай.

Верагодная спроба аднаўленае ЛДП далучыцца да кааліцыі БНФ, лібэралаў, сацыял-дэмакратаў, працавікоў і камуністаў паставіць апазыцыю перад складанай дылемай. З аднаго боку, на Гайдукевічу апазыцыя добра апяклася ў 1999 і 2001 г. Зь іншага боку, ЛДП — гэта частка бізнэсу, такога, якім ён ёсьць у сінявокай Рэспубліцы.

Сукупны рэйтынг пяці апазыцыйных партый з дэмакратычнае кааліцыі перавысіў рэйтынг Аляксандра Лукашэнкі. Раней нават у менш непрыемных сытуацыях такога кшталту лукашэнкаўцы пускалі ў ход цяжкую артылерыю. Хутка пабачым, кім гэтым разам будуць зараджаць гарматы.

**Мікола Бугай**

# Кілер узначаліў «Саюздрук»

Былога міністра інфармацыі Міхаіла Падгайнага прызначылі генэральным дырэктарам рэспубліканскага дзяржпрадпрыемства «Белсаюздрук». Ня спраўдзіліся злыя чуткі аб тым, што экс-міністра адправяць паслом у Пэкін. Ранейшы дырэктар будзе працаваць ва ўстанове першым намесьнікам М.Падгайнага. «Белсаюздрук» — манапольная структура па распаўсюдзе прэсы, а Падгайнага ў міжнародных журналісцкіх арганізацыях называлі не інакш як «кілерам газэтаў». Ці ня ёсьць гэтае прызначэньне сьведчаньнем таго, што ўлада рыхтуе новы віток самага подлага — эканамічнага задушэньня прэсы?

**Барыс Тумар**

# Pomnik vierabju

U centry Baranavič pamiž fantanam i kinateatram «Kastryčnik» ustalavany pomnik vierabju. Ptuška siadzić na paŭtarametrovaj stojcy, paviarnuŭšy hałavu ŭbok. Pad jaje nahami napisana: «2003 hod — hod vierabja damavoha. Da vas ja nazaŭsiody prylacieŭ. Nia vyraj vabić, a Radzima». Ekolahi zaniepakojenyja źmianšeńniem kolkaści hetych maleńkich ptušak u haradach Biełarusi. Sioleta jich nibyta i pabolšała — čarody vierabjoŭ hojsajuć pa vulicach, pa sadach na pryvatnych učastkach. Pakul što la pomnika niama adboju ad dziaciej, jakim karcić pamacać metaličnaha vierabja, moładź uvieś čas fatahrafujecca, trymajučysia za dziubu, staryja prosta padychodziać i čytajuć — u jich čas pomniki stavili tolki sacyjalistyčnym hierojam.

**Rusłan Raviaka, Baranavičy**



INTEX-PRESS

АДКАЗ «НІЎСКАМУ СПАЖЫЎЦУ»

# Усё ж «Купляй беларускае!»

Чаму не спрацоўвае лёзунг «Купляй беларускае»? Гэтае пытаньне часам узьнікае, калі мы аналізуем якасьць айчынных тавараў. Асабліва калі параўноўваем іх з замежнымі вырабамі, вытворчасьць якіх часьцяком знаходзіцца ў аддаленых краінах Азіі і Афрыкі.

Першае, што прыходзіць на розум, — інэрцыя мысьленьня беларускіх спажыўцоў, недавер іх да надзейнасьці і якасьці айчынных тавараў. Старая звычка шапкаваць перад замежнымі лэйбламі ў крыві некаторых суайчыньнікаў.

На справе сёньня ў краіне дастаткова высакаякасных тавараў, якія адпавядаюць самым высокім патрабаваньням. У іх ліку і прадукцыя акцыянэрнага таварыства «Атлянт»: лядоўні, маразілкі і вось новы тавар — пральныя машыны. Аб якасьці атлянтаўскіх пралак сьведчаць такія лічбы: за няпоўныя тры месяцы іх вытворчасьці ні на адзін апарат не атрымана рэклямацыяў. Да таго ж у пакупнікоў прадукцыі «Атлянту» добрыя тылы — шырока разгалінаваная сэрвісная сетка па ўсёй краіне.

Як адказаў мне начальнік атлянтаўскага цэнтру тэхнічнага абслугоўваньня прадукцыі М.Лапацентаў, пры выбары такой складанай тэхнікі, як пральная машына, трэба зьвярнуць увагу на яе сэрвіснае абслугоўваньне, арганізацыю якога ў бальшыні выпадкаў вызначае вытворца. Найбольш удалыя ўмовы, на мой погляд, у гэтым сэнсе для аўтаматычных пральных машын у ЗАТ «Атлянт». Высокая якасьць тэхнікі дала магчымасьць фірме ўсталяваць працяглы гарантыйны тэрмін абслугоўваньня. Запчасткі для праленьне «Атлянт» будуць выпрабляцца на працягу 15 гадоў, а не 5—6, як для імпартных машын. Да таго ж кошт пасьлягарантыйнага рамонту ніжэйшы ў параўнаньні з канкурэнтамі на 20—25%.

Прыйдзе час, і старыя звычкі саступяць месца здароваму патрыятызму ды гаспадарскаму разуменьню таго, што, падтрымліваючы айчыннага вытворцу, мы забясьпечваем высокую якасьць свайго асабістага жыцьця. Я выбіраю атлянтаўскую пральню і ўпэўнены, што яна адпрацуе таксама надзейна, як і мая атлянтаўская лядоўня.

**Атлянтаўскі спажывец**

ХРОНІКА ЎЦІСКУ

**31 ліпеня «зубровец» Міхаіл Воўчак** за ўдзел у сьвяткаваньні Дня незалежнасьці быў аштрафаваны на 30 базавых адзінак (420 тыс. руб.). 25 жніўня ў Менску быў затрыманы маладафронтавец **Барыс Гарэцкі**. 30 жніўня, у дзень нараджэньня А.Лукашэнкі, каля Адміністрацыі прэзыдэнта затрымалі беспрацоўную **Аксану Новікаву** з плякатам «Хутчэйшай папраўкі!». 8 верасьня ёй далі 2800 тыс. руб. штрафу і ў той самы дзень зноў затрымалі за несанкцыянавае пікетаваньне Менскага гарадзкога суду. Там мусіў пачацца працэс па ліквідацыі арганізацыі «Прававая дапамога насельніцтву». 1 верасьня старшыня Жодзінскай суполкі ТБМ **Аляксей Лапіцкі** разам зь **Яўгенам**, актывістам ТБМ, які ўпершыню прыйшоў на акцыю, быў затрыманы падчас збору подпісаў у абарону ліцэю і раздачы інфармацыйных матэрыялаў (у т.л. рэклямных улётак «НН»). Іх адпусьцілі без складаньня пратаколу. Зь верасьня вымушаная зьмяніць месца працы дэпутатка гарсавету Белаазерску, сяброўка БСДП (НГ) **Натальля Акаронка.** Ёй закідаюць палітычную дзейнасьць у школе. Разам з спн.Акаронкай у іншую школу перайшлі некалькі яе калег і вучняў. 8 верасьня каля расейскай амбасады ў Менску былі затрыманыя сябры незарэгістраванай Беларускай партыі свабоды. За пікет у падтрымку чачэнцаў **Юры Данілаў** аштрафаваны на 280 тыс.руб., **Сяржук Высоцкі** атрымаў 10 сутак арышту, суд над **Васілём Парфянковым** перанесены на 11 верасьня. Высоцкі на знак пратэсту абвясьціў галадоўку. 8 верасьня міліцыянты патрульна-паставой службы Палаўчэня і Чубанаў затрымалі маладафронтаўца **Аляксея Лабадзінскага**, які чытаў на вуліцы газэту БПС «Бастыён». У пастарунку 19-гадовага юнака, паводле ягоных словаў, зьбілі й аблілі галаву клеем. А.Лабадзінскі зьвярнуўся з заявай у пракуратуру.

8 верасьня да менскай сядзібы ТБМ, дзе адбываўся гістарычны сэмінар, былі выкліканыя міліцыянты: гарадзкія ўлады перастрахоўваліся ад магчымых «эксцэсаў» падчас Дня вайсковай славы.

**АШ**

# пераварот у своеасаблівай партыі

## Аляксандар Рабатай, Алег Маркевіч, Андрэй Курс, новыя кіраўнікі ЛДПБ, адказваюць на пытаньні «НН»

### Аляксандар Рабатай: Мы — за абарону нацыянальнага бізнэсу

**«НН»: Якія рэформы Вы зьдзейсьнілі б у краіне?**

**А.Р.:** Мы хочам, каб у нашай краіне быў рэабілітаваны нацыянальны бізнэс, які калісьці быў растаптаны ва ўгоду расейскаму капіталу. Мы выступаем за палітычную абарону нацыянальнага бізнэсу. Бо яго адраджэньне і ўмацаваньне — гэта ўмацаваньне нацыянальнай незалежнасьці. Я бачу ў ЛДП рэспэктабэльную партыю беларускіх дзелавых колаў і ўсіх тых, хто падтрымлівае прыватную ініцыятыву. Мы павінны ісьці беларускім шляхам, выкарыстоўваючы вялікі досьвед нашых папярэднікаў — гістарычных лібэрал-дэмакратаў: Дуніна-Марцінкевіча, Каліноўскага і іншых… Мы за духоўнае адраджэньне беларускай нацыі, і стрыжнем яго павінен быць патрыятызм.

**«НН»: Чаму ж такую праграму нельга было зьдзейсьніць пад началам Гайдукевіча?**

**А.Р.:** Наша каманда зрабіла Гайдукевіча лідэрам, а ён палічыў, што партыя і Гайдукевіч — гэта непадзельныя рэчы. «Праўдырызм» нам надакучыў.

### Алег Маркевіч: Мы ачысьціліся ад Жырыноўскага

**«НН»: Якое Вашае стаўленьне да пяціпартыйнай дэмакратычнай кааліцыі, якая ўтвараецца для ўдзелу ў парлямэнцкіх выбарах?**

**А.М.:** Гэта нармальнае палітычнае жыцьцё. Калі партыі вырашылі штосьці зрабіць разам, тут няма нічога кепскага. Нашая партыя пад кіраўніцтвам ужо экс-старшыні Гайдукевіча зь нейкіх прычынаў увесь час сварылася зь імі. Мы гатовыя да дыялёгу з усімі цьвярозымі сіламі, у тым ліку і з прафэсійна настроенымі чыноўнікамі, якія таксама за перамены... Але спачатку разьбяромся ў сваёй партыі. Бо інакш пасьля скажуць: як вы можаце парадкаваць краіну, калі ў вашай партыі ладу няма.

**«НН»: Ці мае ЛДПБ нейкія стасункі з партыяй Жырыноўскага?**

**А.М.:** Ніякіх. Мы ачысьціліся ад ЛДПР. Мы — партыя іншай дзяржавы. І мы не дамо нікому скінуць з рахункаў такую партыю, як наша. Яна заняла сваю нішу. Яна цяпер ачышчаецца, ёй цяжка. Але мы дамо рады, мы моцныя людзі. Мы прымаем усё канструктыўнае, мы адкрытыя да дыялёгу з усімі.

**«НН»: Што Вы думаеце пра чарговы крызыс у беларуска-расейскіх адносінах?**

**А.М.:** Калі суседзі пачалі гаварыць адзін да другога такім тонам, гэта ўжо нядобра. Я ведаю адно, што Рэспубліка Беларусь — гэта сувэрэнная краіна. Я беларус, грамадзянін РБ, і наша ЛДП — партыя сувэрэннай Беларусі. Мы будзем абараняць усё беларускае, менавіта беларускае нацыянальнае. Мы за тое, каб вярнуць беларускі бізнэс «на кругі свае». Мы за амністыю капіталаў, якія былі калісьці вывезеныя за межы тэрыторыі РБ.

### Андрэй Курс: Шукаць пункты судакрананьня з уладай

**«НН»: Як ЛДП ставіцца да палітыкі А.Лукашэнкі?**

**А.К.:** Наша партыя неаднойчы крытыкавала палітыку Лукашэнкі. Але мы рэалісты, таму павінны шукаць нават у складаных сытуацыях пункты судакрананьня з уладай, каб здолець вырваць у яе саступкі.

**Гутарыў Сяргей Ёрш**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Алег Маркевіч хоча спачатку навесьці парадак у партыі, а пасьля ўжо парадкаваць краіну.**

# Грамада не паружавела

**Шушкевіч і Кароль шукаюць згоды, Палевікова стварае Дэмакратычную партыю.**

Зьезд Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады, заплянаваны на 14 верасьня, перанесены на пазьнейшы тэрмін. Старшыня партыі Станіслаў Шушкевіч вырашыў да яго лепш падрыхтавацца — на зьезьдзе мусіла быць перавыбранае кіраўніцтва.

Эпапея з аб'яднаньнем БСДГ і незарэгістраванай Аб'яднанай сацыял-дэмакратычнай партыі цягнулася больш за год. Апошняя так і ня здолела зарэгістравацца. У выніку пра аб'яднаньне ўжо няма гаворкі — прыхільнікі А.Караля мусяць уліцца ў шэрагі Грамады. Менавіта такі варыянт існуе летась прапаноўваў Шушкевіч.

Паводле словаў **Аляксея Караля**, сёлета разам зь ім у БСДГ уступілі больш за 500 чалавек, рыхтуюць заявы яшчэ 50. Зь іх ліку ў Цэнтральную Раду партыі былі кааптаваныя 5 чалавек, зь якіх тры ўвайшлі ў выканкам (Кароль, Знавец і Грыб). Такім чынам, БСДГ павялічылася на чвэрць. Гэта выклікала насьцярогу ў некаторых партыйных старажылаў. Актыўныя каралёўцы, якія засумавалі па легальнай палітыцы, могуць паступова захапіць ключавыя пасады (гэта пацьвердзілі выбары ў мясцовыя саветы, куды прабілася група каралёўцаў). Нават С.Шушкевіч у размове з карэспандэнтам «НН» нэрваваўся: «Што да Караля, дык мне падаецца, што ў чалавека амбіцый крыху больш, чым магчымасьцяў. Ён езьдзіць па ўсім сьвеце і прадстаўляецца як кіраўнік аб'яднанай партыі».



IREX-PROMEDIA



IREX-PROMEDIA

**А.Кароль хоча, каб Грамада набыла сацыял-дэмакратычны зьмест, з чым ня можа пагадзіцца С.Шушкевіч**

Гарачыя баталіі разгарнуліся ў ідэалягічнай сфэры. «Мы перш за ўсё грамадоўцы, а пасьля ўжо сацыял-дэмакраты», — кажа **Станіслаў Шушкевіч**. «Грамаду з сацыялізмам зьвязвае толькі назва. Тут больш гістарычнай пераемнасьці, а яе трактуюць як клясычную сацыял-дэмакратычную партыю», — падтрымлівае яго **Віктар Сазонаў**, старшыня Гарадзенскай абласной арганізацыі. Прыход у партыю новых сяброў, якія маюць іншы погляд на сацыял-дэмакратыю, можа выклікаць паляваньне БСДГ. Гэтага не жадаюць цяперашнія грамадоўцы, многія зь якіх трымаюцца даволі правых поглядаў. Тэарэтык «каралёўцаў» **Анатоль Сідарэвіч** прапануе ўнесьці зьмены ў статут Грамады, шэраг палажэньняў якога супярэчыць самім прынцыпам сацыял-дэмакратыі. Шушкевіч жа лічыць, што сёньня «ўносіць зьмены ў статут вельмі небясьпечна», ды прыводзіць прыклад Эўропы, дзе «адрозьненьне паміж правымі і левымі вельмі і вельмі малое». Выхадзіць — тупік, і пакуль няясна, як апанэнты зь яго выберуцца.

Партыйны зьезд мусіў абмеркаваць палітычны момант і тактыку дзеяньняў у сёньняшняй сытуацыі, пытаньні стаўленьня да выбараў. Мусілі адбыцца й перавыбары кіраўніцтва. Аднак зьезд быў адкладзены. С.Шушкевіч кажа, што зрабіць гэта прапанавалі сябры партыі з Гарадзеншчыны і Гомельшчыны. Магчыма, Шушкевіч проста вырашыў узяць передышку, каб прыняць правільнае рашэньне ў няпростай сытуацыі.

Тым часам адна з былых лідэрак незарэгістраванай АСДП **Валянціна Палевікова** разбудоўвае структуры сваёй новай партыі. У чэрвені 2003 г. была заснаваная Беларуская дэмакратычная партыя (БДП), у якую ўлілося жаночае крыло былой АСДП. «У беларускім грамадзтве існуе нэгатыўнае стаўленьне да сацыял-дэмакратыі, — гаворыць Палевікова. — Таму ў назьве нашай партыі «сацыял» зьнікла, засталася адна «дэмакратыя»... Гэта ня чыста жаночы праект: каля траціны сяброў БДП — мужчыны. У размове з карэспандэнтам «НН» В.Палевікова прызналася, што пераканалася ў слушнасьці гэтага кроку. З «двухпалай» партыяй працаваць прасьцей. У Палевіковай чатыры намесьнікі: прадпрымальніца Ірына Палядава, альпіністка Ірына Вялянкова, бізнэсвумэн Алёна Жулега і прафсаюзны дзяяч Станіслаў Каласоўскі. Аднак Мінюст маўчыць і рэгістраваць новую партыю не сьпяшаецца.

**Сяргей Ёрш**

# Газавая ломка




КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

**Працяг са старонкі 1.**

Тое самае тычыцца росту заробкаў у прыватным сэктары, павелічэньня тавараразвароту, які падтрымліваецца танным гуртовым гандлем, што нарэшце зьявіўся ў буйных гарадах, і г.д. Аднак увесь гэты адносны дабрабыт трымаецца на рэштках беларуска-расейскай інтэграцыі, якую апошнія верасьнёўскія падзеі ды заявы могуць канчаткова пахаваць.

## Дарагі рубель

Увесь пазытыў так ці інакш зьвязаны з тым, што рэальны абменны курс беларускага рубля ў апошнія гады значна завысіўся. Падвышэньне рэальнага абменнага курсу і выклікае рост актыўнасьці ў «неэкспартным сэктары», які арыентуецца на ўнутраны рынак, — у сфэры нерухомасьці й паслугаў. Патаньненьне імпарту падтрымлівае пакупніцкую здольнасьць насельніцтва.

Але занадта дарагі рубель падрывае канкурэнтаздольнасьць экспарту: дэфіцыт гандлёвага балянсу дасягае ўжо мільярда даляраў, што для Беларусі — гіганцкая сума, бо вымагае агромністага фінансаваньня. Дэфіцыт цісьне на нацыянальную валюту, гуляючы на паніжэньне яе курсу. З апошнім праблемаў пакуль не было, бо «пад валютную інтэграцыю» Беларусь атрымлівала стабілізацыйныя крэдыты ад Расеі. Пры такім раскладзе можна было адмовіцца ад рэфармаваньня рэальнага сэктару, ня думаць пра рэалістычную манэтарную палітыку. Нарэшце, пастаўкі газу па цэнах «пятага поясу» Расеі дапамагалі падтрымліваць унутранае пераразьмеркаваньне і затыкаць дзіркі там, дзе было трэба. Не сакрэт, што спажыўцы атрымліваюць газ па цэнах, што моцна розьняцца ад закупных. Малаімаверна, каб уся розьніца ішла ў прэзыдэнцкія фонды, як піша расейская прэса. Падтрымка прадпрыемстваў-банкрутаў, пэнсіянэраў, сельскай гаспадаркі была б тады немагчымая ў тых памерах, у якіх яна практыкуецца.

## Удар з рэформамі і без

Адмова ад валютнай інтэграцыі (а значыць, і ад далейшых крэдытаў), а таксама дэмарш «Газпрому» азначае канец усяму гэтаму. У суме гэта цягне на дадатковыя выдаткі ў памеры 500 млн даляраў у год. (Паводле падлікаў «НН», 300 млн даляраў; гл. артыкул Уладзя Калупаева «Двайное дно расейскіх датацый» у №42 за 2002. — **Рэд.**) Што адбудзецца далей з эканомікай — прагназуйце самі. Сцэнар можа быць вельмі падобны да ўсходнеазіяцкага, аргентынскага ці нават расейскага (узору 1998 г.). Там таксама ўсё пачыналася з каляпсу пераацэненай нацыянальнай валюты, якую раптам не было каму і чым падтрымліваць.

Магчымыя наступствы — банкаўскі крызыс (асаблівы ўдар па тых, хто трымае грошы на рублёвых дэпазытах), заняпад усіх сэктараў, што ў апошнія часы квітнелі, зьніжэньне пакупніцкай здольнасьці. Дадайце да макраэканамічных структурныя праблемы беларускай эканомікі, магчымасьць банкруцтва шматлікіх прадпрыемстваў з тых 50%, што стратныя сёньня. Банкруцтвы наўрад ці будуць масавымі (некаторых патаньненьне рубля нават выратуе). А вось удар па жыцьцёвым узроўні насельніцтва, асабліва той часткі, дабрабыт якой залежыць ад дзяржаўнага пераразьмеркаваньня, можа быць вельмі істотны. Калі ня верыце, прыгадайце, якім падвышэньнем камунальных коштаў скончылася леташняя газавая атака.

Адбываецца тое, што і мусіла адбыцца. Газавы «камунізм» пасадзіў беларускую эканоміку на наркатычную іголку, і чым даўжэй гэты нарказман — эканоміка на ёй сядзіць, тым цяжэй будзе зьлезьці. Сытуацыю можна было б выкарыстаць, каб нарэшце распачаць неабходныя рэформы. Але — палітычны момант зусім не пасуе для такіх захадаў. Маецца на ўвазе магчымы рэфэрэндум ці які іншы спосаб працягу паўнамоцтваў Лукашэнкі. Прызначаць яго на момант, калі насельніцтва адчуе самы магутны ўдар рэформаў, раўназначна палітычнаму самагубству. Але калі расейскія пагрозы зьдзейсьняцца, удар непазьбежны і без усялякіх рэформаў.

## Шляхі дэзінтэграцыі

Цяжка ўявіць, што расейскі ўрад і «Газпром» ня бралі пад увагу магчымыя палітычныя наступствы сваіх захадаў. Беларуска-расейская дэзінтэграцыя выглядае ня менш палітызаванай, чым сваім часам інтэграцыя. Тады ўсё працавала на карысьць Лукашэнкі, цяпер — супраць яго. Відаць, выконваецца пэўная палітычная замова. А значыць, справа нават ня ў тым, што беларускі лідэр ня хоча расейскага рубля ці не зьбіраецца аддаваць «затанна» беларускую ўласнасьць. Каб і аддаў — не ўратаваўся б, бо страта стратэгічных камандных вышыняў у эканоміцы робіць яго бездапаможным перад палітычным ціскам.

Дзеяньні афіцыйнага Менску залежаць ад таго, ці існуе насамрэч палітычная замова. Калі не, Лукашэнка вымушаны будзе саступаць Маскве. Калі так — саступкі бессэнсоўныя. Тады кіраўніку дзяржавы застанецца выбраць паміж двума варыянтамі. Першы — тэрмінова палепшыць адносіны з Захадам, каб атрымаць хоць нейкія крэдыты (візыт місіі МВФ у Беларусь — знакавая падзея, якая сьведчыць, што такі варыянт прапрацоўваецца). Гэта дазволіць выйграць час, але запатрабуе хоць дэкаратыўнай, ды лібэралізацыі. А значыць, рэфэрэндум пакуль адкладаецца. Другі варыянт — працаваць выключна сілавымі мэтадамі ўнутры краіны, інтэнсыфікаваць зьнішчэньне ўнутранай апазыцыі, каб перажыць цяжкія часы на абсалютна голым палітычным полі. Тады рэфэрэндум правядуць у найбліжэйшы час, магчыма, да зімы. Як яно будзе насамрэч — хутка пабачым. Шмат што праясьніцца ўжо пасьля саміту СНД у Ялце.

**Віталь Сіліцкі**

ПОШТА РЭДАКЦЫІ

## Жніво ў нас і ў Польшчы

Гэты жнівень мне давялося прабыць у Польшчы. Цікава было паглядзець, як адбываецца жніво ў нашых заходніх суседзяў. За месяц я толькі раз пачуў у навінах згадку пра яго. У Польшчы ня ўводзілася надзвычайнае становішча, але ўраджай быў сабраны ў аптымальныя тэрміны. У нас жа ствараюцца розныя штабы, праводзяцца нарады, уводзіцца спэцыяльны расклад працы для дзяржаўных службоўцаў. Якое б ні было надвор’е, год для нас заўсёды цяжкі; а калі што і вырасла, дык толькі нягледзячы на прыродныя ўмовы. Між іншым, з школьнага курсу батанікі вядома, што расьліны растуць дзякуючы тым умовам — сонцу і дажджу.

Гледзячы наша тэлебачаньне, можна зрабіць выснову, што толькі адзін чалавек у краіне ведае, калі трэба сеяць і жаць. У часе ўборачнай кампаніі вёску наведваюць розныя камісіі і праверкі, прычым некаторыя правяральшчыкі ня могуць адрозьніць жыта ад ячменю. Але ўсе нечаму вучаць, загадваюць, прымаюць меры і г.д. Цяжка ўявіць сабе паліцыю на Захадзе, якую б прыцягвалі да мерапрыемстваў па захаваньні ўраджаю. Проста там чалавек сам у сябе красьці ня будзе. А ў нас, паводле неафіцыйнай інфармацыі, міліцыі даводзіцца плян затрыманьняў зладзеяў. На Захадзе да ўборкі ўраджаю не прыцягваюцца студэнты і школьнікі, «шэфы» з гораду. У жніўні значная частка палякаў, у тым ліку і многія дзяржаўныя службоўцы, едуць адпачываць на мора. І жніво не зрываецца. Сакрэт тут просты — прыватная ўласнасьць на зямлю.

Вядома, простым увядзеньнем прыватнай уласнасьці на зямлю ўсіх праблемаў сельскай гаспадаркі ня вырашыш. Але рана ці позна мы да гэтага прыйдзем. Бо ня можам мы быць разумнейшымі за астатні сьвет, у якім усё будуецца на прыватнай уласнасьці. Лепшай мадэлі яшчэ ніхто ня вынайшаў, на гэта паказвае досьвед Паўночнай Карэі або Кубы. Але ёсьць пэўныя сілы ва ўладных структурах, якім выгадна захоўваць цяперашні стан справаў у сельскай гаспадарцы. Пытаньне ў тым, колькі яшчэ вытрымае наша вёска.

**Зьміцер Лупач, Глыбокае**

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

## Плянаваны дэфіцыт бюджэту — 0,5% ад ВУП

Як стала вядома агенцтву БелаПАН з кулюараў парлямэнту, **урад плянуе скласьці бюджэт наступнага году з дэфіцытам 0,5% ад валавога ўнутранага прадукту краіны** пры зьніжэньні сярэдняе падатковае нагрузкі на 2%. Сёлета дэфіцыт бюджэту складае 1,5%. Магчымы рост цэнаў на газ распрацоўшчыкі ў разьлік ня бралі. Экспэрты лічаць такі малы дэфіцыт нерэалістычным.

## Абыходныя шляхі «Газпрому»

**«Газпром» можа выкарыстаць канфлікт зь Беларусяй як дадатковую нагоду для будаўніцтва газаправоду па дне Балтыйскага мора ў Нямеччыну.** А другую чаргу газаправоду «Ямал — Эўропа», што ідзе праз Беларусь, — адкласьці. Зрабіць гэта дазваляюць і пляны будаўніцтва новага газаправоду з Казахстану праз Украіну да мяжы з Вугоршчынай, па якім патрэбны аб’ём газу будзе трапляць на Захад. Спрыяе і новае расейска-польскае газавае пагадненьне. Раней «Газпром» абавязваўся пракласьці другую галіну газаправоду «Ямал — Эўропа» ў Польшчу да канца 2001 г., а потым абавязацельствы ануляваў. Дэкляруецца толькі, што справа тае інвэстыцыі будзе вырашаная да канца 2004 г. А заплянаваны аб’ём газу пойдзе ў Польшчу іншымі шляхамі.

## 26016 куфляў

**Магілёўскі АБЭЗ затрымаў жыхара Пінску, які перавозіў на аўтамабілі МАЗ 13008 літраў піва расейскай вытворчасьці без суправаджальных дакумэнтаў.** Кантрабанда ацэненая ў 33 млн рублёў.

## Навінкі Франкфурцкага аўтасалёну

**На 60-м міжнародным Франкфурцкім аўтасалёне прэзэнтавана 125 навінак.** Барацьба за першае месца ў гольф-клясе разгорнецца між «Фальксвагенам Гольфам V», «Опэлем Астрай» и «Маздай-3». Новы «Гольф» большы за папярэднія мадэлі. Даўжыня павялічылася на 57 мм, шырыня — на 24, а вышыня — на 39. Пасажыры на задніх сядзеньнях маюць 6,5 лішніх сантымэтраў прасторы для ног. «Гольф» мае 6 падушак бясьпекі, 5 падгалоўнікаў, траўмабясьпечныя рулявую калёнку і пэдальны вузел. Трываласьць кузава вырасла на 80%. «Опэль Астра» прапануе пакупнікам прынцыпова новы дызайн і шырокую гаму рухавікоў (ад 80 да 200 к.с.). Козыры «Астры» — шматлікія электронныя «памочнікі кіроўцы».

«Мазда» зрабіла акцэнт на спартовасьці. Пакупнікам прапануюць магутныя высокаабаротныя маторы ў яскравай і стылёвай абалонцы.

Прыхільнікаў «БМВ» важданіна ў гольф-клясе не чапляе: зьявіліся найноўшая «шасьцёрка» і пазадарожнік X3! «Шасьцёрка» «БМВ» будзе каштаваць 110 тыс. даляраў, X3 — 60 тыс.

Кансэрватыўны «Ягуар» прывёз на выставу першы ў гісторыі фірмы сэрыйны «ўнівэрсал» «X-Type Estate». Зьмяніліся лінія даху, дзьверы, бакавыя дэкаратыўныя панэлі, задні бампэр. «Вольва», калега «Ягуару» па фордаўскім цэху, зь вялікай помпай прэзэнтавала новае пакаленьне S40.

## Нямеччыне трэба дактары

**Дзяжурства ў больніцы — гэта праца, а не адпачынак, абвясьціў у аўторак Эўрапейскі трыбунал, адказваючы на зварот нямецкага лекара**. Дагэтуль у Нямеччыне лічылася, што працоўны час мэдыка — гэта хвіліны, патрачаныя на працэдуры, а не на чаканьне ў дзяжурцы. Але доктар падчас дзяжурства ня можа вольна распараджацца сваім часам. Цяпер нямецкім больніцам давядзецца набраць ад 15 да 27 тыс. дактароў, некалькі соцень тысяч мэдсёстраў і санітараў. Невядома, адкуль ва ўмовах пустых фондаў і рэформы нямецкай сыстэмы аховы здароўя ўзяць сродкі, дзе знайсьці патрэбных дактароў. У Нямеччыне толькі сем тысяч беспрацоўных мэдыкаў.

## Золата ў цане

**Золата наблізілася да 7-гадовага цэнавага максымуму — 382,8 даляра за унцыю.** Гэтаму паспрыяла падзеньне амэрыканскай валюты. З пачатку году даляр патаньнеў у параўнаньні з эўра на 6,6%. Цэны на золата, адпаведна, павялічыліся на 9,9%.

**СП**

# Усход перад Захадам

## Фотарэпартаж карэспандэнта «Associated Press» Сяргея Грыца

Першае ўражаньне ўсіх, хто трапляе ў Ірак, — у краіне нічога не будуецца. Час нібыта спыніўся. Вырашэньне побытавых праблемаў хвалюе іракцаў больш, чым стварэньне нацыянальнага ўраду. Калі б амэрыканцы забясьпечылі гарады сьвятлом і вадой, стаўленьне да іх было б значна лепшым. А пакуль на дарогах часьцей сустрэнеш машыны саюзьнікаў з калючым дротам, чым з прамысловымі таварамі ці якой сельгастэхнікай.

Гандаль у Іраку квітнее. Асартымэнтам багдадзкая крама мала розьніцца ад менскай — тая ж кава, гарбата, напоі. Толькі што вытворцы іншыя — арабскія краіны. У іракцаў і амэрыканцаў аднолькава папулярныя прыдарожныя рэстарацыі, дзе смачна і нядорага кормяць.

Выехаць з Іраку ў Ярданію альбо Сырыю можна толькі праз блёк-пасты з сур’ёзным пашпартным кантролем. Шмат уцекачоў спрабавалі пераходзіць мяжу нелегальна і гінулі на велізарных мінных палях...

Вайна скончылася, але ваяваць працягваюць. Саюзьнікі — з 21 верасьня сярод іх нашы суседзі: палякі, украінцы і літоўцы — кантралююць свае базы і штабы, блёк-пасты, асноўныя магістралі, парты ды нафтавыя сьвідравіны.

Саюзьнікі пакуль нічога ня могуць зрабіць з партызанкай, якая ня мае сталых базаў і фармацыяў. Амэрыканскія вайскоўцы знэрваваныя. Яны нясуць хоць і невялікія, але штодзённыя страты. Ангельскія жаўнеры спакайнейшыя, сьмела ходзяць сярод іракцаў. Але, бывае, і яны трапляюць у засады.







У Іраку працуюць тысячы іракцаў-паліцыянтаў, якія прайшлі сур’ёзную праверку. Праца небясьпечная: у гарадах расьпе者разаліся «алі-бабы» (зладзеі) — раскрадаюць тое, што яшчэ не расьцягнулі за вайну, расстрэльваюць ахоўнікаў парадку. А вось супрацоўнікаў мясцовай «дзяржаўтаінспэкцыі» іракцы папросту ігнаруюць, як і правілы дарожнага руху. Таму на ўсіх скрыжаваньнях — стабільныя аўтазатоы.

Дзёрзкі праект пабудовы мусульманскае дэмакратыі праз акупацыю краіны, паводле японскае мадэлі, далёкі ад завяршэньня.

**Павал Сумарока**



**Амэрыканцы праводзяць «зачыстку» каля г.Баакуба на поўначы ад Багдаду, дзе часта адбываюцца дывэрсыі партызанаў.**



**Ірацкія жанчыны просяць вызваліць арыштаваных падчас зачысткі «партызанскай» вёскі мужчынаў.**

## Унікальны суд у Пецярбургу

**У Пецярбурскім абласным судзе ідзе першы ў сучаснай гісторыі Пецярбургу крымінальны працэс з удзелам прысяжных паверанных.** Яшчэ адна асаблівасьць — падсудныя запатрабавалі перакласьці ўсе дакумэнты на беларускую мову. Расейскія законы гэта гарантуюць. Першым піцерскім судовым перакладчыкам стала Алена Картавіцкая, выпускніца філфаку менскага ўнівэрсытэту.

## Бясплатныя візы ў ЭЗ

**Эўракамісія прапануе ўвесьці новы тып візаў для грамадзянаў Беларусі, Украіны, Малдовы і Расеі. Бясплатныя візы будуць выдавацца тым, хто жыве не далей за 50 км ад мяжы з ЭЗ.** Дакумэнт дазволіць знаходзіцца ў межах краіны, што выдала візу, да сямі дзён запар і да 90 сутак за паўгоду. Эўракамісія хацела б увесьці новы тып візаў да траўня 2004 г., аднак перш пастанову мусяць зацьвердзіць урады ўсіх краін ЭЗ.

## Дыпляматычны скандал у Літве

**Літоўскіх дыпляматаў вэрбуюць замежныя спэцслужбы — найперш усходнія.** Некалькі тыдняў таму былі адпраўленыя ў адстаўку сем консулаў, што працавалі ў пасольствах у Беларусі і Расеі. Іх зьвінавацілі ў хабарніцтве. Доказы — відэазапісы. Кадры, на якіх зафіксаваныя моманты атрыманьня хабару за афармленьне візаў, зрабілі агенты... расейскіх спэцслужбаў. Літоўскі дэпартамэнт бясьпекі лічыць, што відэастужкі маглі паспрыяць вэрбоўцы скампрамэтаваных консулаў. Як яны трапілі ў рукі літоўцаў, не паведамляецца. Вэрсія «беларускага сьледу» не адкідаецца.

## Вайна забрала 52 тысячы

**Сама меней 12 тыс. расейскіх салдат і 40 тыс. цывільных загінулі ў чачэнскіх войнах, сьцьвярджае маскоўская «Новая газета».** Мінабароны паведамляе пра 9 тыс. забітых салдатаў, аднак яно ня ўлічвае тых, хто памёр у шпіталях. Зьвесткі пра страты сярод цывільных узятыя ў Дзяржкамстаце Расеі.

## Французы едуць у вёску

**Да 2020 г. насельніцтва француcкай вёскі вырасьце ўдвая.** Заможныя прадстаўнікі сярэдняй клясы ўзялі за моду пераяжджаць «у правінцыю». Новыя жыхары часта дыктуюць «старым» свае ўмовы. Так, бургундзкіх вяскоўцаў шакаваў новы сусед, якому штодня прывозілі прадукты на таксі з Парыжу (180 км). Ён замаўляў іх праз Інтэрнэт, а ўвечары сустракаў таксоўку на парозе. Бываюць і сур’ёзныя канфлікты, асабліва калі «перасяленцы» разгортваюць на новым месцы бізнэс. Ёсьць і станоўчыя бакі: людней французская вёска, ствараюцца новыя працоўныя месцы. Праўда, далёка ад мэгаполісаў гараджане сяліцца ня хочуць. Сёньня ў сельскай мясцовасьці жыве 25% французаў, зь іх толькі кожны пяты працуе ў сельскай гаспадарцы.

## Італьянцы — самыя тоўстыя

**Італьянскія дзеці займаюць першае месца ў Эўропе па колькасьці хворых на атлусьценьне: 36% зь іх маюць залішнюю вагу.** У Гішпаніі гэты паказчык складае 27%, у Швайцарыі — 24%, у Францыі — 19%. У Расеі і Польшчы — ня больш за 9%.

## Нарвэжкі затуркалі нарвэжцаў

**Нарвэскія жанчыны пераняли сэксуальную ініцыятыву.** Паводле вынікаў дасьледаваньняў, што працягваліся сем год і ахапілі 2,7 тыс. маладзёнаў, нарвэжкі раней за нарвэжцаў пачынаюць полавае жыцьцё, часьцей займаюцца сэксам і выяўляюць у ложку большую агрэсіўнасьць, чым іх партнэры. Маладыя мужчыны ўсё больш схіляюцца да самаізаляцыі і самастойнага задавальненьня сваіх палавых патрэбаў. Жанчыны ж «ідуць у сьвет» і цешацца сваёй сэксуальнай свабодай.

**CM; MN**

# Сабор які аб’яднаў праваслаўных

**У ЗША адбыўся Сабор беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. Раскол, які цягнуўся амаль дваццаць гадоў, ліквідаваны.**


Паседжаньне новаабранай Рады БАПЦ на чале зь мітрапалітам Ізяславам.

Сабор прайшоў 30 жніўня ў царкве Жыровіцкай Маці Божай у Гайленд-Парку (штат Нью-Джэрзі). Сьвятары з ЗША, Канады, Вялікай Брытаніі ды Аўстраліі сабраліся, каб фармальна пацьвердзіць аб’яднаньне дзьвюх частак БАПЦ, якія ад 1984-га існавалі асобна. Царкву ачоліў мітрапаліт Ізяслаў, былі абраныя Рада і Кансысторыя. Сабор прыняў зварот да праваслаўных беларусаў, у якім дэкляруецца ўзмацненьне сувязяў «паміж прыходамі замежжа і прыходамі ў Беларусі».

Перамовы пра аб’яднаньне пачаліся ўлетку 2002-га — пасьля сьмерці мітрапаліта Мікалая, што ачольваў адну з частак БАПЦ (другой кіраваў Ізяслаў). Той раскол перашкаджаў Аўтакефальнай царкве перанесьці сваю дзейнасьць на Бацькаўшчыну, хоць ідэя аўтакефаліі мае нямала прыхільнікаў сярод праваслаўных вернікаў і сьвятароў. Пра гэта сьведчаць неаднаразовыя спробы зарэгістраваць у Беларусі аўтаномныя прыходы Аўтакефальнай царквы, якія пачаліся ў сярэдзіне 1990-х. Многія памятаюць і заяву Аляксандра Лукашэнкі, які ў сьнежні 2002-га паабяцаў мітрапаліту Філарэту не дапусьціць зьяўленьня ў краіне структураў БАПЦ.

Але нават пасьля аб’яднаньня па-за БАПЦ застаюцца некаторыя вернікі і сьвятары. Згадаем дзейнасьць «патрыярха» Юр’я Рыжага (Беларуская аўтакефальная праваслаўная (народная) царква, сьвятара Івана Спасюка, а таксама япіскапа Аляксандра Салагуба. Па справе апошняга Сабор прыняў адмысловую рэзалюцыю, што пацьвярджае яго адлучэньне ад БАПЦ.

Былога супрацоўніка Аддзелу замежных царкоўных зносінаў Расейскай праваслаўнай царквы Салагуба ў 2000 г. хіратанізаваў у япіскапы мітрапаліт Мікалай, які, магчыма, бачыў у ім пераемніка. Аднак той самы Мікалай праз год, перад сьмерцю, адлучыў яго ад БАПЦ. У пачатку чэрвеня 2002-га, яшчэ пры жыцьці Мікалая, Салагуб спрабаваў «пераняць» уладу і нават правёў дзеля гэтага свой Сабор. У жніўні 2002 г. ён заключыў зь мітрапалітам Ізяславам дамову пра аднаўленьне «малітоўна-кананічнай лучнасьці», але мітрапаліт яе праз тыдзень скасаваў... У выніку на сёньняшні момант Салагуб служыць у адным беларускім праваслаўным прыходзе ў Кліўлендзе.

Мітрапаліту Ізяславу (Івану Бруцкаму) 77 гадоў. Ён родам з Століншчыны. На эміграцыі апынуўся падчас другой сусьветнай вайны. На сьвятара быў высьвячаны ў 1979 г., а хіратанізаваны ў япіскапы — у 1981 г. У траўні 1984-га на Саборы БАПЦ у Манчэстэры Ізяслаў быў абраны мітрапалітам. Адна з галоўных ягоных задачаў — стварэньне гіерархіі Царквы, якая сёньня фактычна адсутнічае (у выпадку сьмерці Ізяслава ў БАПЦ не застанецца япіскапаў), і хіратанізацыя новых япіскапаў. Ад посьпеху гэтай справы будзе залежаць аўтарытэт ды імідж Царквы, якая зьбіраецца вярнуцца ў Беларусь.

**Алег Тачоны**

## Зварот Сабору БАПЦ у замежжы да праваслаўных беларусаў у дыяспары й на Бацькаўшчыне

Дарагія ў Хрысьце браты й сёстры!

У сёньняшнім цяжкім для нашага народу часе ўсім нам патрэбная збаўленчая сіла Хрыстовага вучэньня. Хрыстос вучыў любіць адзін аднаго, дапамагаць тым, хто патрабуе дапамогі, спачуваць тым, хто пакутуе, падтрымліваць на духу тых, хто абезнадзеіўся. Такіх людзей у Беларусі сёньня вялікая колькасьць, і, як выглядае, лік іх з кожным годам расьце.

Беларуская аўтакефальная праваслаўная царква (БАПЦ) ад часу свайго заснаваньня многія стагодзьдзі таму назад выконвае ролю ахоўніка душы й маралі нашага народу, спрыяльніка ягонаму духоваму й матэрыяльнаму дабрабыту. Такая высакародная місія выплывае з самой ідэі аўтакефаліі, гэта значыць з ідэі служэньня перш-наперш свайму народу. Палюбі свайго бліжняга як самога сябе, навучаў Хрыстос.

Аўтакефалія — гэта самакіраўніцтва, гэта спалучанасьць рэлігійнага жыцьця з нацыянальнымі сьвецкімі патрэбамі ды інтарэсамі. У бальшыні праваслаўных краінаў (Баўгарыя, Сэрбія, Румынія ды іншыя) краёвыя цэрквы ўгрунтаваныя на прынцыпах аўтакефаліі. БАПЦ у замежжы, адноўленая ў 1948 г., перахоўвае гэты прынцып. Дбаючы пра духовае й матэрыяльнае адраджэньне Беларусі, БАПЦ ушаноўвае з асаблівай увагай сьвятых свайго народу, карыстаецца ў багаслужбах і прапаведзях беларускай мовай, спрые пашырэньню друкаванага роднага слова. Усё гэта ў згодзе з запаветам Збаўцы нашага Ісуса Хрыста, Які пасьля Свайго ўваскрэсеньня сказаў апосталам: «Дык ідзеце, навучайце ЎСЕ НАРОДЫ» (Мц. 28:19). Наш беларускі народ павінна навучаць СВАЯ праваслаўная царква. А «своя» — гэта значыць аўтакефальная.

Чарговы сабор БАПЦ быў скліканы з думкай пра ўмацаваньне й пашырэньне праваслаўя сярод беларусаў у замежжы й на Бацькаўшчыне. Сабор прыняў пастановы аб удасканаленьні структуры й кіраўніцтва БАПЦ, а таксама аб узмацненьні сувязяў паміж прыходамі замежжа з прыходамі ў Беларусі. Былі абмеркаваныя таксама пытаньні матэрыяльнай дапамогі праваслаўным прыходам на Бацькаўшчыне.

Няхай нам Бог дапаможа ў праслаўляньні Божага імя ды ў нашым служэньні свайму народу.

## Барыс Данілюк:
# Кантактаў зь Філарэтам не плянуецца



Барыс Данілюк (зьлева) зь мітрапалітам Ізяславам.

Галава аб’яднанай БАПЦ мітрапаліт Ізяслаў ад інтэрвію ўстрымліваецца — пазьбягае «неадпаведных тлумачэньняў» сваіх словаў. Адказаць на пытаньні карэспандэнта «НН» пагадзіўся ўдзельнік Сабору сакратар Кансысторыі БАПЦ, рэдактар газэты «Царкоўны пасланец» Барыс Данілюк.

**«НН»: Спадару Барыс, ці раскол у царкве насамрэч пераадолены?**

**Б.Д.:** Раскол выгас ужо сам сабою. Сабор толькі фармальна зацьвердзіў паўсталую сытуацыю. Гэта стварае магчымасьці задзіночанай дзейнасьці ўсяго духавенства і вернікаў БАПЦ.

**«НН»: Якія парафіі БАПЦ былі прадстаўленыя на Саборы?**

**Б.Д.:** На Саборы былі прадстаўленыя дэлегатамі альбо праз упаўнаважаньні ўсе дзейныя парафіі БАПЦ з ЗША, Канады, Англіі і Аўстраліі, за выняткам аднае. Ад парафіі ў Стронгсвіле (Кліўленд) у штаце Агаё дэлегатаў не было. Да выбараў іх, дзеля сваіх прыватных інтарэсаў, не дапусьціла група, што там захапіла ўладу.

**«НН»: Ці былі дэлегаты з Бацькаўшчыны?**

**Б.Д.:** Паколькі гэта быў Сабор (зьезд) зарэгістраваных паводле замежных законаў парафіяў (праўных адзінак), удзел у ім прадстаўнікоў з Бацькаўшчыны не прадбачыўся. Запрошаны госьць зь Беларусі (паводле нашых зьвестак, гэта праваслаўны сьвятар — прыхільнік аўтакефаліі. — СЁ), на жаль, ня змог атрымаць упару візу і на Сабор не пасьпеў.

**«НН»: Пастанова наконт А.Салагуба прымалася аднагалосна ці былі розныя думкі?**

**Б.Д.:** Не, рэзалюцыя была прынятая безь пярэчаньняў — аднагалосна.

**«НН»: А чаму Сабор ніяк не адзначыў дзейнасьць Рыжага і Спасюка?**

**Б.Д.:** Бо дзейнасьць тая нагэтулькі анэкдатычная, што ўспамін пра Рыжага і Спасюка ў рэзалюцыі быў бы незаслужаным імі гонарам.

**«НН»: Дзеля чаго былі ўнесеныя зьмены ў статут БАПЦ?**

**Б.Д.:** Папраўкі ў статуце былі зробленыя дзеля прадухіленьня расколаў у будучыні. Цяпер у спрэчных справах канчатковае і пастаноўнае слова мае Рада БАПЦ.

**«НН»: Ці можна чакаць актывізацыі дзейнасьці БАПЦ у Беларусі? Калі так, то як яна мяркуе будаваць кантакты зь Беларускім экзархатам РПЦ?**

**Б.Д.:** Узнаўленьне Беларускай аўтакефальнай царквы на Бацькаўшчыне ёсьць няспынным імкненьнем нашае Царквы. Якім шляхам яно пойдзе і што можна будзе рабіць у гэтай справе, пакажа будучыня. Кантактаў жа БАПЦ з Экзархатам Маскоўскага патрыярхату ў Беларусі не прадбачыцца.

**Запісаў Сяргей Ёрш**

### ДАВЕДКА «НН»:

**БАПЦ** мае парафіі ў Аўстраліі — Яравіль (Мэльбурн) і Кількены (Адэляіда), у Ангельшчыне — Манчэстэр і місія ў Валіі (яшчэ 4 парафіі, прыпісаныя да Манчэстэру, дзеля нястачы сьвятара — неактыўныя), у Канадзе — Таронта (Антарыё) і ў стадыі арганізацыі парафія ў Монтрэале (Квэбэк), у ЗША — Бруклін (Нью-Ёрк) і Гайленд-Парк (Нью-Джэрзі). Парафія ў Стронгсьвіле (Кліўленд, ЗША) кантралюецца япіскапам Аляксандрам Салагубам. На эміграцыі існуе і некалькі беларускіх праваслаўных парафіяў (у ЗША — тры, у Канадзе — адна і ў Ангельшчыне — дзьве; адна з апошніх «узбунтавалася», і лёс ейны пакуль нявысны), якія знаходзяцца **ў юрысдыкцыі Канстанцінопальскага патрыярха**. Усе беларускія праваслаўныя парафіі на эміграцыі налічваюць некалькі соцень вернікаў. У ЗША існуе таксама **Беларуская аўтакефальная праваслаўная (народная) царква** на чале з Э.Рыжым, зь якім у Беларусі трымае сувязь сьвятар Леанід Акаловіч.

МУЗЫКА

# Кумыс з «Крамбамбуляй»



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У аўторак у невялічкім (усяго на 50 месцаў), але вельмі ўтульным менскім клюбе «Графіці» можна было пакаштаваць адразу два рэдкія напоі — кумыс і крамбамбулю. Шкада, «Крамбамбуля» была толькі музычная — Вольскі і кампанія ўпершыню гралі ў Менску песьні з альбому «Каралі раёну». А вось кумыс быў сапраўдны, арганізатары адшукалі напой аж пад Баранавічамі. Прывезьлі некалькі скрыняў, каб зрабіць канцэрт весялейшым. У сваіх чаканьнях яны не падмануліся, хоць алькаголю ў кумысе — як у піве.

Вольскі паміж песьнямі распавядаў гісторыі пра кумыс (Лявон паўночы сядзеў у Інтэрнэце — рыхтаваўся). Гледачы дазналіся, што кумыс у сваіх нататках згадваў яшчэ Герадот, а каханка Леніна Інэса Арманд, калі была ў высылцы, лекавалася з дапамогай гэтага напою...

«Каралі раёну» былі ня ў поўным складзе — адсутнічаў Сяргей Міхалок. Вольскі сьпяваў разам з Кулінковічам. Еднасьць з «заляй» настала літаральна праз адну-дзьве песьні, бо ўсе былі пэўныя, што безалькагольнае піва не для іх. Калі Кулінковіч сьпяваў «Марскога чалавека», ніхто не зварухнуўся: настолькі гэта было пранікнёна. Падчас выкананьня астатніх песень крыху затуманены кумысам лідэр «Нэйра Дзюбелю» хадзіў між столікамі ды заглядаў у вочы дзяўчатам.

**Сяргей Будкін**

# Юбілей Настаўніка



**Белакоз А. Каб жыла Беларусь: Артыкулы, успаміны, інтэрвію.** — Менск: «Беларускі кнігазбор», 2003

Стваральніку Гудзевіцкага літаратурна-краязнаўчага музэю (на Мастоўшчыне) настаўніку Алесю Белакозу 11 верасьня спаўняецца 75 гадоў. Выдавецтва «Беларускі кнігазбор» выдрукавала кнігу юбіляра «Каб жыла Беларусь. Успаміны, артыкулы, інтэрвію». У зборнік увайшлі ўспаміны А.Белакоза пра Ларысу Геніюш, Міколу Прашковіча, Уладзімера Караткевіча і інш., згадкі пра стварэньне Гудзевіцкага музэю ды выявы яго ўнікальных экспанатаў: адзіны ў сьвеце беларускі глёбус зь Віленскай беларускай гімназіі, каменны рукамыйнік з паганскага могільніка, падвойны дыван, які падарыла музэю Л.Геніюш… Несавецкая беларушчына 60—80-х гадоў XX ст. паўстае на старонках гэтай унікальнай кнігі. Шкада, што наклад выданьня — толькі 200 ас.

**Рэдакцыя «НН» далучаецца да віншаваньняў.**

# Спрэчка Ведзьмакоў

**Працяг са старонкі 1.**

Абодва прэтэндэнты спасылаюцца на рэчавыя доказы — у прыватнасьці друкарку, на якой быў адбіты першы асобнік паэмы. Друкарка захоўваецца ў Гілевіча, аднак Аўрамчык цьвердзіць, што раней яна належала яму: «Гілевіч потым выкупіў яе ў мяне за 60 рублёў».

Кожны «Вядзьмак» мае сваіх сьведкаў. Н.Гілевіч спасылаецца на Васіля Быкава і сваю жонку, М.Аўрамчык — на Пімена Панчанку, Максіма Танка і... Васіля Быкава. Жывых няма.

Пэўны адказ на пытаньне можа даць старанная літаратуразнаўчая экспэртыза. Прафэсар Зьміцер Бугаёў адзначае, што часткі «Сказу» розьняцца паводле мастацкага ўзроўню. «Зь іншага боку, — разважае ён, — калі Аўрамчык кажа, што гэтая паэма проста сьмяхоцьце, дык што, ён ня ведае цаны гэтаму твору?» Прафэсар Міхась Тычына катэгарычны: «Адчуваецца, што стваралі паэму розныя аўтары».

Зрэшты, нават Ніл Гілевіч не адмаўляе Аўрамчыкавага ўдзелу — кажа толькі, што доля вершаў таго была нязначнай. Выглядае на тое, што пісалі ўсё ж удвух: Аўрамчык — знаны гумарыст, Гілевіч — творца больш патасны і лірычны. У «Сказе» яскрава выявіліся абодва. Але долю сваю ў напісаньні слаўнага твору кожны вызначае па-свойму.

**Аркадзь Шанскі**

# З «Масквы» ў Беларусь



WWW. ROPNET.RU

Фрагмэнты інтэр’еру гатэлю «Масква», зьвязаныя з гібельлю Янкі Купалы, будуць перавезеныя ў Менск. Гэта дзьверы нумару 414, у якім спыняўся паэт, парэнчы, церазь якія ён зваліўся, і пліты, аб якія разьбіўся. (Ідэю вывезьці гэтыя экспанаты да капітальнай перабудовы гатэлю падаў летась на старонках «НН» Сяргей Навумчык.) Сяргей Вечар, дырэктар музэю, зьвярнуўся ў гэтым пытаньні па падтрымку да беларускага пасла ў Расеі сп.Грыгор’ева. Супольнымі намаганьнямі фрагмэнты гатэльнага інтэр’еру ўдалося выратаваць. 8 верасьня з расейскай сталіцы вярнулася загадчыца экспазыцыйнай часткі музэю Глафіра Кушаль. Яна і паведаміла: нямыя сьведкі апошніх імгненьняў Купалавага жыцьця стануць часткай экспазыцыі.

**АШ**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Багдановіч М. Вянок:** Кніжка выбраных вершаў. — Факсым. выд. — Менск, 2003. 2500 ас.

Славутая кніга з друкарні Марціна Кухты перавыдаецца факсымільна другі раз. Каштуе 1240 руб.

**Рудакоў А. Беларускія абрадавыя сьвяты = Рудаков О. Белорусские обрядовые праздники:** Метод. пособ. для сценаристов и организаторов белорус. календарных обрядовых праздников. — 2-е выд., дап. — Іркуцк, 2003. — 58 с. 300 ас.

Першая кніга па-беларуску, выдадзеная ў Іркуцку. Аўтар — навуковец, старшыня Іркуцкага таварыства беларускай культуры.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Зубр андэрграўнду



АЛЕСЬ КОЗІК

**11 верасьня Вінцэсю Мудрову споўнілася 50 гадоў.** Шлях яго ў літаратуры быў пакручасты і містычны. Сын савецкага афіцэра, ён быў вызвалены ад вывучэньня беларускай мовы і літаратуры. Але раз, зьбіраючы макулятуру для школы, вучань Віця Мудроў узяў у рукі падраную кнігу і вырашыў уголас прадэклямаваць вершык на «сьмешнай» мове. Кніга аказалася зборнікам паэзіі Багдановіча... Пасьля гэтага лёсавызначальнага «кантакту» Мудроў пачаў самастойна, з надзвычайнай упартасьцю вучыць мову. Паступіўшы ў Наваполацкі політэхнічны інстытут, хлопец стварыў сябрыну аматараў беларускага слова і ўзяўся выдаваць рукапісны альманах «Блакітны ліхтар». Неўзабаве пра дзейнасьць наваполацкіх спадкаемцаў Скарыны даведаліся спадкаемцы Дзяржынскага. Пачаліся «разборкі».

Доўгі час Мудрова наагул не друкавалі. Толькі з пачаткам перабудовы адна за адной выйшлі дзьве яго кнігі. У другой палове 90-х празаік-нанканфарміст зноў зьнік з старонак дзяржаўных літвыданьняў. У 1999 г. ТВЛ выдае трэцюю кнігу Мудрова «Зімовыя сны».

Біяграфіі гэтага зубра андэрграўнду вы ня знойдзеце ў сёньняшніх энцыкляпэдыях. Сапраўдная слава Вінцэся Мудрова яшчэ чакае.

**Алесь Аркуш**

IN MEMORIAM

# Ніна Брыль

У 1937 г., калі вучаніцы Стаўпецкае гімназіі Ніне Клаўсуць, было 16 гадоў, пачалося Яе сяброўства з начытаным 20-гадовым юнаком зь вёскі Загора, энтузіястам самадзейнага тэатру Іванам Брылём. Іх збліжаў дух вальнадумства: не адмаўляючы Бога, вызнаючы «валадарства Божае ўнутры нас», яны не прымалі ні аднае афіцыйнае формы рэлігіі.

Скончыўшы ў 1939 г. гімназію, Яна паступіла ў Шчучынскі пэдагагічны ліцэй, ды вучыцца не давялося: у верасьні прыйшлі саветы. Чырвонаармейцы — у абмотках і непаглядных мундзірах — завіталі раз на вясковыя танцы і, пабачыўшы, як апранутыя дзяўчаты і хлопцы, спыталіся: «У вас все кулаки, что ли?» Тады ж, у верасьні 39-га, пасьля абарончых баёў на польскім Узьбярэжжы, шараговы марское пяхоты Ян Брыль трапіў у палон. Заможных Клаўсуцяў ня вывезьлі ў Сібір толькі таму, што выбухнула нямецка-савецкая вайна: вагоны ўжо былі гатовыя, а 21 чэрвеня 1941 г. у Міры і яго ваколіцах пачаўся хапун.

Яны, настаўніца школкі ў Жухавічах Ніна Клаўсуць і Брыль, сустрэліся ў канцы 1941 г., калі ён вярнуўся зь Нямеччыны. Яны былі надта прыкметныя людзі, каб перасядзець ліхалецьце ціха. Так і апынуліся ў лесе. Яна — настаўніцаю «зялёнае школы».

Настаўніцтва стала Яе лёсам. Маючы добрую лінгвістычную базу, атрыманую ў гімназіі, Яна адносна лёгка атрымала дыплём настаўніцы замежных моваў, каб выкладаць нямецкую ў Інстытуце народнае гаспадаркі, а потым ангельскую ў БДУ. Адносна, бо, апрача вучобы, ужо меўся сямейны клопат: у студзені 1945-га Яна стала жонкаю Янкі Брыля — Брыліхаю, як Яе назвалі ў літаратурным асяродзьдзі і па-за ім.

Ведаючы пяць эўрапейскіх моваў, Яна была і крытыкам, і памочнікам мужу, і настаўніцаю дзецям.

Сваёю жыцьцярадаснасьцю, энэргічнасьцю, працавітасьцю Яна зьдзіўляла ўсіх, хто зь Ёю — ужо немаладою жанчынаю — сустракаўся першы раз.

Цяжка было даць веры, што Яе спасьціг страшны ўдар — інсульт, а сьледам паралюш. Але такая ўжо безабаронная істота чалавек.

Гэтыя два з палавінаю апошнія месяцы зь Ёю былі дочкі, сын і ўнукі, якіх Яна любіла і якімі ганарылася. Зь Ёю быў муж, зь якім Яна заставалася аднадумнаю ўсё жыцьцё. Калі 6 верасьня здарылася непапраўнае, хамы ў высокіх кабінэтах, апавешчаныя пра гэта, «не знайшлі» Ніне Брыль месца на могілках у межах гораду.

…Штовясны Яна імкнулася на лецішча ў Панямоньне. Яе вабіў лес. Яна любіла зьбіраць грыбы і ягады. Цяпер над Яе магілкаю ў Калодзішчах шапацяць бярозкі і шумяць маладыя хвоі.

**Анатоль Сідарэвіч**

---

Янка Брыль хацеў пахаваць жонку на Кальварыі. Дарма што могілкі лічыцца закрытымі, там практыкуюцца «камэрцыйныя пахаваньні». Побач з жонкай хацеў легчы ў свой час і сам пісьменьнік.

Адміністрацыя Кальварыі самачынна даць дазвол на пахаваньне не наважылася. Старшыня Саюзу пісьменьнікаў Алесь Пашкевіч зьвяртаўся з просьбай паспрыяць да віцэ-прэм’ера Ўладзімера Дражына, намесьніка кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Алега Праляскоўскага, кіраўніка Літфонду й дэпутата савету рэспублікі Мікалая Чаргінца. Дапамогу абяцалі ўсе. Адгукнуўся толькі М.Чаргінец: запрапанаваў Янку Брылю... сваю машыну.

**АШ**

# Сьвята прайшло, помнікі засталіся

Дзень беларускага пісьменства прайшоў у Полацку 7 верасьня. Як ні ўглядаўся я ў натоўп, што віраваў на цэнтральным праспэкце Маркса, — знаёмыя твары трапляліся рэдка. Вось прамільгнулі муж і жонка Віктар Шніп і Людміла Рублеўская, вось позірк выхапіў зь людзкой плыні твар Алеся Пісьмянкова, мільганулі постаці Пашкевіча, Бутэвіча, Савіцкага, Баравіковай...

Ані Барадуліна, ані Мэльпамэны — аддалі пад тэатар будынак гарадзкога ДК і ўзяліся сур’ёзна яго рамантаваць. Пакуль невядома, як філія павінна функцыянаваць — ці будзе мець сталую трупу, зь якіх крыніцаў будзе фінансавацца. Аднак тая акалічнасьць, што на прэм’еры прысутнічаў міністар культуры Леанід Гуляка, надавала праекту пэўную пэрспэктыву.

На адкрыцьці памятнага знака літары «Ў», якое адбылося яшчэ 6 верасьня, мяне «забіла напавал» журналістка тэлеканалу АНТ, якая прызналася, што дасюль ня можа зразумець, адкуль узяліся гэтыя беларусы. Беручы інтэрвію ў Ігара Куржалава, яна марна спрабавала ўгаварыць яго казаць па-расейску. «Дык літара ж беларуская, і канал ваш беларускі», — дзівіўся мастак. «У нас такой формат», — тлумачыла някемліваму палачаніну ўся здымачная брыгада АНТ. «А я не магу казаць пра беларускую літару па-расейску, ды яшчэ на Дні беларускага пісьменства», — не здаваўся Куржалаў.



Сп. Хадановіч каля памятнага знака літары «Ў» у Полацку

Таксама 6-га ў наваполацкай цэнтральнай бібліятэцы адбылася прэзэнтацыя кнігі Вольгі Іпатавай «Альгердава дзіда». Праўда, гэтае мерапрыемства прайшло па-за афіцыйнай праграмай. Парупілася сама пісьменьніца.

Падчас сьвята няпроста было знайсьці беларускамоўныя выданьні. Нават «Мастацкая літаратура» не зрабіла да Дня беларускага пісьменства свайго стэнду. Толькі выдавецтва «Кніга» прывезла ў Полацак акрамя сваёй прадукцыі яшчэ й двух паэтаў — Ніла Гілевіча і Леаніда Драньна-Майсюка. Сівагаловы Ніл Сымонавіч сьціпла сядзеў на лаўцы пад полацкімі каштанамі й старанна пакідаў на сваіх томіках аўтографы. Па іх амаль увесь дзень стаяла чарга.

Галоўнай падзеяй сьвята сталася адкрыцьцё помніка Сімяону Полацкаму (аўтар Аляксандар Фінскі) — бронзавая скульптура паўстала ў сквэрыку насупраць кінатэатру «Радзіма». За некалькі дзён да гэтай падзеі ў Полацку пайшла чутка, што праваслаўныя ярархі адмаўляюцца асьвячаць помнік былому манаху-базыльяніну. Аднак у дзень сьвята япіскап Полацкі і Глыбоцкі Феадосі ля манумэнту казаў пра карысьць асьветніцтва, нават згадаў, што ў Беларусі найлепшыя ў сьвеце праграмісты.

А галоўнай госьцяй сьвята стала Анжаліка Агурбаш (экс-Ліка Ялінская). Нікога не вазілі па сьвяточным Полацку (у вялізным браневіку-джыпе) з такой помпай і сьвітай. Беларускія міністры выглядалі ў параўнаньні з расейскай госьцяй сьціплымі тубыльцамі. Сьпявачка наведала школу-інтэрнат для адораных дзяцей і перадала ёй у падарунак дзьве тысячы агульных сшыткаў з уласным партрэтам на вокладцы. Адмыслова да сьвята для Агурбаш у Маскве напісалі песьню «Евфросинья», у якой ёсьць такія радкі: «Крест Евфросиньи Полоцкой, земли русские сохрани. Братьев, сестер с молитвою Вечным Миром объедини». Сьпявачка падаравала гораду 500 кампактаў з гэтай песьняй. У інтэрвію полацкай тэлекампаніі «Квант» Агурбаш сказала, што Полацак для яе асаблівы горад — бо гэта радзіма яе бацькі.

Таварыства вольных літаратараў ладзіла на беразе Дзьвіны акцыю-пэрформанс «Вершы на пяску». Дзякуючы абвестцы ў «НН», паглядзець на яе прыехалі нават дзьве настаўніцы з Жодзіна. Акцыю фільмаваў полацкі тэлеканал «Квант», гэты рэпартаж быў апэратыўна паказаны тэлегледачам на наступны дзень. А ўвечары ля каменя з эмблемай ТВЛ паўгадзіны чытаў вершы Андрэй Хадановіч. Маляўнічы краявід з ракой Палатой, Верхнім замкам, Сафійкай надаваў выступу асаблівую кранальнасьць і каштоўнасьць. Сапраўднае мастацтва ня любіць тлуму й чыноўніцкага ўздзелу.

**Алесь Аркуш**

# Ворша–2003

**Сёлета на Крапівенскае поле пад Воршу ехалі разам з экскурсійнай групай праз Талачын і Смаляны. У Талачыне праваслаўная царква была пабудавана як уніяцкая. Бацюшка распавядае пра гісторыю сабору спакойна: «У тыя часы, калі будаваўся наш храм, большы ўхіл быў у унію». Запрашае прыехаць налета на канфэрэнцыю, прысьвечаную гадавіне збудаваньня храму.**



ВІКТАР АНДРЭЕЎ

У Смалянах усе ахвотна фатаграфуюцца на фоне старога дамініканскага кляштару. Дабрацца да руінаў «Белага Ковелю» — замку, што пабудавалі князі Сангушкі ў XVII ст., не ўдалося: дажджы ператварылі яго навакольле ў непраходную мясцовасьць.

У аршанскім касьцёле Сьв.Язэпа ксёндз запытаўся: «Вы, мабыць, прыйшлі паглядзець карціну з Аршанскай бітвай? Па вачах бачу». Копія карціны «Бітва пад Воршай» (арыгінал — у Варшаве) захоўваецца ў касьцёле. Калі пад’яджжалі да Богаяўленскай царквы праваслаўнага Куцеінскага манастыра, адзін з спадарожнікаў запытаўся: «А што, манастыр таксама раней быў уніяцкім?» Давялося тлумачыць, што ў нас ня ўсе праваслаўныя цэрквы былі раней каталіцкімі ды ўніяцкімі храмамі…

На Крапівенскае поле прыехалі поначы. Міліцыя запісвала ў нататнікі нумары ўсіх машынаў. На пытаньне кіроўцы, чаму запісваюць, быў адказ:

— А раптам з вамі што-небудзь здарыцца?

— Што са мной можа здарыцца? — разгубіўся кіроўца.

— А вы ўпэўнены, што з вамі нічога ня можа здарыцца?

Намёты абыходзіла кампанія з маёра ды чатырох сэржантаў, шукала галоўнага арганізатара. Не знайшоўшы «галоўнага», міліцыя саступіла месца кадэбэшнікам. Тыя прыбылі зь відэакамэрамі, запэўніваючы, што здымаюць для асабістых архіваў.

Пасьля грэка-каталіцкага набажэнства ды рыцарскіх двубояў сьпявалі барды. Ігар Мухін-Рабянок, Серж Мінскевіч, як і два Зьмітры — Бартосік і Сідаровіч — выконвалі старыя песьні. Праўдзівай зоркай глядзеўся Андрэй Хадановіч. Адкрыцьцём фэсту сталася паэтка Таццяна Барысік — аўтарка «НН» і канкурэнтка Хадановічу ў сфэры іранічнае паэзіі. Гэтая абаяльная дзяўчына і атрымала саламяную «Залатую карону» фэсту ад Алеся Пушкіна і Арыны Вячоркі. А бард з Жодзіна Павал Красоўскі атрымаў рыцарскі пярсьцёнак. Сам Пушкін не спыняе шакаваць публіку: «Едзе Лукашэнка на танку пад бел-чырвона-белым сьцягам. Вакол танка Вячорка, Лябедзька, Севярынец. А зьверху надпіс: «На Вільню!»

Ад папярэдніх фэст розьніўся й тым, што сёлета ўдзельнікі пачалі піць раней, чым звычайна. Ужо гадзіне а дзявятай-дзясятай вечара ладная палова ўдзельнікаў была нападпітку. Асабліва шчыравалі аршанскія сацыял-дэмакраты: піл і «За салідарнасьць!» і проста так. Скончыўся фэст дыскатэкай і прыездам Андрэя Мельнікава. Стомлены папярэднімі выступамі генэратар адмовіўся працаваць для «бацькі» аршанскага фэсту — Мельнікаву давялося сьпяваць безь сьвятла ды мікрафона.

**Прысутны**

# Зорка Данілюк

**Яна была Артысткай. Прыгажуня з уладарным позіркам, аднолькава эфэктная ў вопратцы гішпанскай герцагіні, цыганкі, фараонавай дачкі і Алесі з Палесься. У яе быў цудоўны голас, адначасова звонкі і аксамітны, цёмна-вішнёвы, прыдатны для розных характараў і стыляў. Цяпер гэты голас змоўк. Апошнім часам гучаў ён рэдка, у маленькіх залях. Мо таму Артыстка адмаўлялася лекавацца, чым фактычна падпісала сабе сьмяротны прысуд.**

Калі Сьвятлана прыйшла паступаць у Кіеўскую кансэрваторыю, прыёмная камісія была ўражаная ейным мэцца-сапрана і сілай волі: нотаў дзяўчына ня ведала, арыі развучвала на слых. Яе прынялі на вячэрняе аддзяленьне і накіравалі ў клясу народнай артысткі СССР Зоі Гайдай. Гайдай сама была самавучкай, яна разумела Сьвятлану. Як вынік — партыя Любашы з «Царскай нявесты», засьпяваная на выпускным, да канца жыцьця заставалася ейнай візытоўкай.

Неяк яе пачуў дырыжор Барыс Афанасьеў, выціснуты зь менскае Опэры ў пермскую. На яго запрашэньне 23-гадовая Сьвятлана прыехала працаваць у Перм. Гэта быў не найгоршы варыянт. Пермскую Опэру нельга было назваць правінцыйнай. Падчас вайны тамака кватаравала Марыінка, пасьля туды цягнуліся артысты — былыя вязьні ГУЛАГу, якім не дазвалялася жыць у сталіцах.

У 1964-м Данілюк упершыню выйшла на сцэну з другой сваёй «візытоўкай» — Кармэн. А налета, на запрашэньне Ларысы Александроўскай, засьпявала партыю Кармэн у Менску. Але пасьля, як «малады спэцыяліст», мусіла вяртацца ў Перм і дапрацоўваць трохгадовы тэрмін.

Назусім у Беларусь яна прыехала пасьля 1966-га, дыпляманткай III Міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага. У сярэдзіне 1960-х на менскай сцэне слылі сапрана Нінэль Ткачэнка і Тамара Ніжнікава, тэнар Зінові Бабій, барытоны Аркадзь Саўчанка і Анатоль Генералаў, бас Аскольд Сухін... А вось моцнага мэцца-сапрана не было. На вакантнае месца і ўзялі Данілюк. «Нацыянальных кадраў» бракавала. У Опэру ахвотна бралі ўкраінскіх сьпевакоў, часта з «сумнеўнымі» біяграфіямі. Уладкавацца ў сталіцах яны не маглі, затое старанна будавалі прыгожы фасад беларускага мастацтва. Асабліва пільная ўвага надавалася таму фасаду за Машэравым. Памятныя «ўрадавыя канцэрты» тых часоў. За два тыдні ў Палац спорту альбо ў Опэру зганяліся на рэпэтыцыі сотні людзей: ад вучняў да народных артыстаў. Рэпэтавалі ўвечары і ўначы па 8—9 гадзінаў запар. Асноўнай мэтай было адрэгуляваць сьвятло і гук, стварыць зьвязкі паміж нумарамі. С.Данілюк, як і «Песьняры», была абавязковай удзельніцай гэткіх мерапрыемстваў. Радасьці мала, але гарантавала бясьпеку ад свавольства культур-чыноўнікаў.

## Алеся пятае рэдакцыі

Найактыўней Данілюк у гэты час сьпявала ў беларускіх опэрах. Увесну 1967 г. тэатар змагаўся зь пятай рэдакцыяй «Алесі» Цікоцкага. Данілюк выконвала галоўную ролю. Але ўсе спробы стварыць сцэнічную вэрсію опэры скончыліся няўдачай. У 1968 г. музыка спэктаклю — але ня сам ён — была ўганараваная Дзяржпрэміяй БССР. Яшчэ раней «Алеся» зьнікла з рэпэртуару.

Да беларускіх опэраў тады ставіліся з пагардаю. Наскрозь фальшывыя «сацрэалістычныя» сюжэты ня вабілі артыстаў. Эстэтыка псэўданароднасьці, навязаная зьверху, прафанавала нацыянальнае мастацтва, замінала ягонаму разьвіцьцю. З другога боку, беларускія опэры былі невычарпальнай крыніцаю тытулаў, прэміяў і хвалебных рэцэнзіяў. На гэткім фоне як сьвежы подых успрымалася опэра Юр'я Семянякі на лібрэта Алеся Бачылы «Зорка Вэнэра». Там спн.Данілюк засьпявала партыю Веранікі — рамантычнай каханкі паэта.

Але галоўнай падзеяй тых гадоў была для яе «Аіда» і роля Амнэрыс. У 1970-м беларуская «Аіда» прэзэнтавалася на сцэне Марыінскага і Вялікага тэатраў. Сьвятлана Данілюк адразу ж сталася народнай артысткай БССР.



Кармэн



Сьвятлана Данілюк у ролі Амнэрыс; партнэр Зінові Бабій.



## Рэвалюцыя для мэцца-сапрана

У 1973 г. яе накіравалі на стаж у «Ля Скаля». Паехалі ўдзьвюх, разам з Тамарай Сіняўскай, жонкай Мусьліма Магамаева. Сяброўства не завязалася. Настаўніцай Данілюк падчас навучаньня ў «Ля Скаля» была Маргарыта Карозія — выдатнае каляратурнае сапрана 1930—40-х. Працавалі над дзьвюма партыямі: Сантуцы зь «Вясковага гонару» і Разыны з «Сэвільскага цырульніка».

Зьехаць зь Міляну прыйшлося яшчэ да заканчэньня тэрміну. Сын Максім сумаваў і хварэў бяз маці. «Вясковы гонар», як і ўсе замежныя опэры, ішоў у Менску па-расейску. Таму сьпявачка мусіла перавучыць партыю Сантуцы па-расейску і перакрэсьліць усё, чаму яе вучылі ў Італіі.

Цяпер большасьць опэраў ідзе на мове арыгіналу, а яшчэ 15 гадоў таму Марыя Гулегіна жорстка пасварылася з кіраўніцтвам Опэры, якое прымушала яе перавучваць па-расейску партыю Амэліі («Бальмаскарад»). Яе Гулегіна рыхтавала ў «Ля Скаля» і слушна баялася, што адна мова з другой будзе канфліктаваць. Дырэкцыя Опэры не магла сабе ўявіць гэткага канфлікту і ціснула, у выніку чаго Гулегіна зьехала за мяжу.

У 1979 г. Сьвятлана Данілюк дамаглася-такі новае пастаноўкі «Сэвільскага цырульніка», што дазваляла выконваць партыю Разаны сьпявачкам з рознымі тыпамі галасоў. Дагэтуль у опэрных тэатрах СССР Разыну сьпявалі каляратурныя сапрана, хаця кампазытар пісаў партыю для нізкага голасу. Віною таму была эстэтыка расейскіх імпэратарскіх тэатраў. Прывілей на дзявочасьць і прыгажосьць там мелі каляратурныя сапрана — пранізьлівыя, як ільдзістыя іголкі, якімі пры канцы зімы ашчэрваюцца гарадзкія дахі. Мэцца-сапрана асацыявалася з пачуцьцёвасьцю, нават вульгарнасьцю, драматычнае сапрана — з жарсьцю і сьценабойнаю моцай. Данілюк зламала гэты стэрэатып. Партыю Разыны яна сьпявала філігранна і нечакана гарэзьліва.

## Норма Папялушкі

У 1980-м загінуў Машэраў. Новы кіраўнік Мікалай Сьлюнькоў ня надта цікавіўся сваім іміджам у вачох беларусаў і пра мастацкі «фасад» для сваёй улады не клапаціўся. Данілюк вымушаная была ўлетку 1986 г. пайсьці з тэатру.

Спачатку па ўсім СССР адкрыта шукалі ёй замену; штомесяц адбывалася праслухоўваньне чарговай залётнай мэцца-сапрана. Потым на спэктаклі, у якіх была занятая Данілюк, сталі запрашаць гастралёраў. А калі й гэта не дапамагло, тыя спэктаклі зьнялі з рэпэртуару як «састарэлыя». Усё гэта суправаджалася папрокамі: маўляў, Данілюк «не выконвае нормы». Штомесяц сьпявачцы прадпісвалася паўдзельнічаць сама меней у дзевяці спэктаклях. Гэта амаль як заданьне для Папялушкі. Апроч таго, ёй забаранілі гастраляваць без дазволу начальства. «Тэатр я пакінула паводле ўласнага жаданьня... дырэктара», — распавядала яна пазьней.

Апошняе дзесяцігодзьдзе жыцьця выпала сумным. Нешматлікія канцэрты ў абласных гарадох і ў райцэнтрах. У залях зьбіралася рэдка болей за 30 слухачоў.

У лістападзе 1996-га Сьвятлана Данілюк наладзіла ў менскім касьцёле на Залатой горцы канцэрт у гонар 90-х угодак Данііла Андрэева. Многія, хто бачыў афішу, дзівіліся: што прывяло сьпявачку ва ўлоньне гэтага экумэнічнага містыцызму? Навошта яна ўзялася не за сваю справу — чытаньне вершаў? Мала хто разумеў, што гэта малітва, спроба дакрычацца да суайчыньнікаў, вырвацца з духоўнай самоты.

Дакрычацца, падобна, не ўдалося. Хіба што да ўлады, якая ў 1999-м, у гонар 60-е гадавіны з дня нараджэньня, узнагародзіла Данілюк мэдалём Францішка Скарыны, увяла ў склад Грамадзкай рады па праблемах культуры і мастацтва пры Саўміне. Ці яе цешылі ўсе гэтыя фармальныя адзнакі? Напэўна, недастаткова, каб падсаладзіць горыч паступовага разьвітаньня з сцэнай.

Жоўцекамянёвую хваробу, ад якой пяюльлі ня стала, сучасная мэдыцына вылечвае. Руцінная апэрацыя, якую зробяць у любым шпіталі, плюс крыху пасьляапэрацыйнага адпачынку — і былы пацыент гатовы распачаць жыцьцё нанова. Данілюк упарта не хацела зьвяртацца да лекараў. Нават калі пачала губляць сілы. І на апэрацыйны стол трапіла запозна. Дзікунства? Баязьлівасьць? Напэўна не. Найхутчэй, «забойца №1» — дэпрэсія, што пазбаўляе чалавека волі да жыцьця. І чалавек робіцца лёгкаю здабычаю немачаў, няшчасьцяў ды сьмерці.

У год, калі нарадзілася Сьвятлана Данілюк, адбывалася вялікае супрацьстаяньне Марсу — як і сёлета, у год ейнай сьмерці. Марс нясьцерпна зыркаю зоркай зьзяў над яе калыскаю — а цяперака над труною. Ейная зорка...

**Юлія Андрэева**

Анатоль Гладышчук

# Берагі Бога



Буг, што на мясцовым дыялекце сугучна з словам Бог.

Заходні Буг — рака памежная, зь беларускага боку яна для простага грэшнага недаступная. Для большасьці насельніцтва Прыбужжа гэта містычная рака, якая рэальнай явай на некалькі сотняў мэтраў праступае толькі ў Берасьцейскай крэпасьці, у раёне Цярэспальскіх варотаў, дзе абодва берагі нашыя. Гэта часта ставіць у тупік польскіх аматараў сплаву на плытах і байдарках. Яны лічаць увесь левы бераг Бугу сваім і часьцяком трапляюць да беларускіх памежнікаў як парушальнікі мяжы.

Сярэдзіна Бугу і ёсьць той мяжой, да і пасьля якой дзейнічаюць законы розных краінаў. Але гэта не замінае вадзе Бугу ўсе напрыдумляныя чалавекам надбудовы лёгка па-прыроднаму перамешваць: тут цяжка сказаць, хто і чыю ваду на якім беразе п'е.

Дрыгавічы й валыняне, якія здавён сяліліся ўздоўж Бугу і чые нашчадкі жывуць на абодвух берагах ракі да гэтага часу, сваю прыгожую раку-карміцельку называлі проста Буг, што на мясцовым дыялекце сугучна з словам Бог. Рака для людзей, якія жылі на Бугу, была сапраўды Богам. І дзякуй Богу, што палітыкі не навучыліся мяняць назвы рэк — старадаўніх трымальніц гісторыі мясьцінаў, як, напрыклад, гэта здарылася з памежнай вёскай Полаўцы. Цяпер зь беларускага боку гэта Пясчатка, памежны пераход за Высокім. Але, на дзіва, на польскім штампе ў пашпарце выяўляеш «Połowce». Гісторыя жыве.

Самы буйны горад на Бугу — гэта наша Берасьце, заснаванае тысячу гадоў таму. Горад паўстаў на правым беразе ракі, на мысе, дзе Буг зьліваецца зь левым рукавом Мухаўца. Там цяпер стаіць археалягічны музэй «Берасьце». Калі б ня крэпасьць і не мяжа, сучаснае Берасьце выцягнулася б на многія кілямэтры ўздоўж правага і левага берагоў Бугу. Чалавек гвалтоўна адсунуў горад ад ракі і разьвярнуў яго ў іншым напрамку. Але разьвярнуць экалягічныя праблемы, якія стварае любое вялікае места, не дазволіла прырода — яны ўсутыч прысунутыя да Бугу. Любое самае дробнае надзвычайнае здарэньне на берасьцейскіх ачышчальных збудаваньнях імгненна адгукнецца на левым беразе. Гэтыя яскравы прыклад супярэчнасьці прыроды і палітыкі павінен мацна яднаць правы і левы берагі.

**Усё радзей і радзей сутыкаемся мы з гэтым вось духам простых чалавечых адносінаў, які набыць нельга ні за якія грошы.**





**Каменны крыж у Нэплях (Польшча).**

Буг нават убачыць з правага боку — вялікая праблема. Існуе цэлая сэрыя «нельга», якая забараняе чалавеку, што жыве ў сваёй краіне, падысьці да сваёй ракі. Зь левага берагу ўсё значна прасьцей. Вам ніхто і нішто не замінае падысьці да берагу і нават, прабачце, справіць малую патрэбу пад памежны слуп (не-не, гэтага рабіць ня трэба), палахліва азіраючыся на правы бераг: раптам хтосьці бачыць гэтае беззаконьне. Вядома, палякі на ўсё гэта глядзяць звыкла і непалахліва, госьць жа з правага берагу насьцярожана чакае рэзкага вокрыку з-за любога кусьціка. І гэтае пачуцьцё страху, выхаванае дзесяцігодзьдзямі, зьмяшаць ня можа аніякая рака.

Беларускі бераг Бугу проста-такі ўтыканы шматлікімі сьлядамі і руінамі культуры абодвух народаў, падзеленых мяжой: Скокаўскі палац, Рахвал, хутар Врэда, капліца ў Раковіцы, парк у Сычах, царква ў Вільмовічах, касьцёл у Воўчыне, палац і парк у Высокім….

У Воўчынскім касьцёле — усыпальніцы апошняга караля Польшчы Станіслава думалася: «Якія мы ашаламляльна багатыя, каб быць такімі беднымі?!» Храм ня мае даху, аблокі плывуць над руінамі алтара. Тысячы турыстаў маглі б ехаць сюды і карміць увесь Воўчын ды навакольле — ніякага іншага бюджэту ня трэ было б. Гэта так проста і зразумела, а дырэктар Высокаўскага каледжу Юры Сахарук, які душой хварэе за родны край, услых незразумела каго просіць: «Ну дзе ўзяць вялікі кран, каб зьняць з касьцёлу апошнюю з чатырох сьвятую статую? Схаваю, а потым аддам таму, хто будзе аднаўляць будынак, бо ўсё адно ўпадзе і разаб'еца…» І бяздань неба над касьцёлам праглынае гэтае простае і зразумелае пытаньне, як той стары калодзеж на хутары Врэда паблізу Берасьця, што топіць на неачышчаным дне любыя гукі.

З кола ровара, як ні круці, бачыш і чуеш намнога больш, чым з акна кандыцыянаванага аўтамабіля. Але чалавек так моцна зацікнуты сабе ж навязанымі ўмоўнасьцямі, што лічыць немагчымым сесьці ў сядло ровара ў гадах і пры пасадзе. У адрозьненьне ад Нямеччыны альбо зусім блізкай Славаччыны, Польшча не выкідае ў выходныя натоўпы вэлясыпэдыстаў на цудоўныя прыбускія трасы. Але ў нядзелю ні ў адной «левабярэжнай» вёсцы вы не натрапіце на чалавека з рыдлёўкай ці нечым падобным за працай будзённай. На правым гэта ў парадку рэчаў. Такое ўражаньне, што ўвесь тыдзень чалавек адпачывае, каб у выходныя выкласьціся. Затое зь якой лёгкасьцю на правы бераг перакінулася жаночая звычка да паленьня. Яшчэ дзесяць гадоў таму спадарычна з цыгарэтай у Берасьцейскім тэхнічным унівэрсытэце была зьявай выпадковай. А сёлета рэктар ажно змушаны быў забараніць паленьне ва ўсіх памяшканьнях унівэрсытэту. Выставіў курцоў і курчых на ўсеагульны агляд у спэцыяльна адведзеным месцы на вуліцы. Ці паўплывае гэта на сытуацыю — невядома, дачакаемся зімы... Ровар не пазбаўляе чалавека ад гэтай кепскай звычкі, але ён дае шанец нягвалтоўнага выбару.

Вялікі стары мост на шашы Беласток—Люблін перакідае вас ня проста з правага берагу Бугу на левы. Розныя ўлады ў розныя часы, распаўсюджваючыся значна то на адзін, то на другі бок ад Бугу, навязвалі людзям свае прыярытэты, культуру, рэлігію і мову. Перамешваліся, як вада ў Бугу, мовы, культуры, веры; але нязьменным заставаўся чалавек. Таму на любым беразе Бугу на праваслаўна-каталіцкіх могілках ты абавязкова заўважаеш беларускія прозьвішчы, напісаныя «польскай» лацінкай. Паляка ж на нашым беразе зьдзівяць польскія прозьвішчы, накрэсьленыя «рускай» кірыліцай. Праз гэта кожны з нас усьведамляе еднасьць прыбускіх каранёў, культуры і традыцый. Тут ужо Буг нічога разьдзяліць ня можа. А калі бабачыш у польскай вёсцы гаспадара ў знаёмай кепцы, моцна насунутай на заўсёдна заклапочаны лоб, усё становіцца канчаткова зразумелым.

У любым, нават такім малым падарожжы на роварах, як нашае, краем вока пасьпяваеш выхапіць фрагмэнты, якія вызначаюць узровень быцьця. Паміж Ставамі і Воўчынам у цені бярозкі, ля курганоў, сустрэліся дзьве немаладыя жанчыны з поўнымі вёдрамі духмяных лясных малінаў. Стомленыя сьпёкай і зьбіраньнем ягадаў, яны спачатку ня дужа даверліва ўспрынялі нашае «прызямленьне» побач. Але, дазнаўшыся пра мэты падарожжа, з такім запалам пачалі частаваць нас ягадамі, што, баючыся зьесьці ўсё, мы ускочылі ў сёдлы і пакацілі да Воўчына. Ужо пазьней падумалася: як гэта проста і прыемна — прыняць такі пачастунак. Але ўсё радзей і радзей сутыкаемся мы з гэтым вось духам простых чалавечых адносінаў, які набыць нельга ні за якія грошы. І мы часта нават не падазраём, што менавіта па гэтую кропельку «старога сьвету» і адкрытай дабрыні едзе да нас заходні турыст, якога незразумела дзеля чаго мы мардуем гадзінамі на сваёй «жалезнай» мяжы.

Скокі—Раковіца—Воўчын—Высокае—Полаўцы—Грабарка—Міжвіца—Нэплі—Цярэспаль

**Фатаздымкі аўтара**



**«Ну дзе ўзяць вялікі кран, каб зьняць з касьцёлу апошнюю з чатырох сьвятую статую? ...ўсё адно ўпадзе і разаб'еца...»**

# Польскія літаратурныя часопісы: канец фільму

**Жыцьцё беларускае культуры пасьля лукашызму многім уяўляецца раем з залатымі дажджамі. А цяперашняе падзеньне накладаў «тоўстых» часопісаў зьвкла тлумачаць палітычным уціскам. З палону савецкіх ілюзіяў выбавіць тэкст Робэрта Асташэўскага пра сёньняшнюю сытуацыю на польскім рынку літаратурных часопісаў.**

**Ня значыць, што ў Польшчы блага, а ў Беларусі добра. За Бугам 150 літаратурных выданьняў і разьвіты нацыянальны кніжны рынак. У нас у другой палове 90-х адбылася сапраўдная культурная катастрофа, між тым польскае кіно, літаратура, тэатар прадукуюць творы сусьветнае вядомасьці. У Польшчы сотні творцаў жывуць з ганарараў, у нас — адзінкі.**

**Польскае сёньня, мусіць, будзе нашым заўтра. Працэсы, пра якія піша польскі крытык, незваротныя: роля літаратуры й высокае культуры ў інфармацыйным грамадзтве іншая, чым яна была, напрыклад, у савецкі час. Замест таго каб наракаць на надвор'е, чалавек мае да яго прыстасоўвацца. Каб тварыць.**

У Польшчы некалькі сотняў культуралягічных часопісаў, якія выходзяць на паперы ці ў Інтэрнэце. Большасьці вядомая толькі невялікая іх частка. Між тым, шмат якія з тых часопісаў цікава пішуць пра мастацтва, вакол іх утвараецца ўласнае асяродзьдзе, віруе культурнае жыцьцё. Два штомесячнікі, познанскі «Arkusz» і варшаўская «Res Publika Nowa», яшчэ да нядаўняга часу лічыліся стабільнымі часопісамі, а ў параўнаньні зь іншымі грамадзка-культурнымі выданьнямі — нават заможнымі. Яны рэгулярна выходзілі, мелі, здавалася б, фінансава трывалых выдаўцоў: у выпадку «Arkusza» гэта была «Выдавецкая арцель Велікапольшчы», «Res Publikę» падтрымліваў часопіс «Polityka». Аж раптам выявілася, што травеньскі нумар познанскага штомесячніка — апошні, а варшаўскі часопіс пераходзіць на штоквартальны выхад.

## Камэрцыйна нявыгадная культура

На пачатку 90-х у польскіх літаратурных колах панавала ўпэўненасьць, што папулярныя грамадзка-палітычныя выданьні можна будзе прыцягнуць да прапаганды якаснай літаратуры і ўтварэньня новых структураў культурнага жыцьця. Але праз некалькі гадоў выявілася, што камэрцыйныя СМІ праводзяць уласную палітыку і ня лічацца зь меркаваньнямі пісьменьніцкіх асяродкаў. Сяго-таго такая сытуацыя зьдзівіла, іншым дала нагоду для больш ці менш цынічных камэнтароў, але ў цэлым тон дыскусіі быў хутчэй жаласьлівы. Міт пра тое, што камэрцыйныя СМІ хочуць браць удзел у фармаваньні рынку культуралягічных часопісаў, гіне на нашых вачах.

Гэта, уласна, не павінна зьдзіўляць. Вышэйзгаданыя СМІ дыямэтральна розьняцца ад спэцыялізаваных часопісаў. Першыя арыентуюцца на прыбытак, другія ня толькі непрыбытковыя, але й ня могуць існаваць без датацый. Штодзённыя газэты і штотыднёвікі разьлічаны на так званага сярэдняга чытача — своеасаблівы фантом, створаны рэдактарамі і спэцыялістамі-маркетолягамі, — штомесячнікі ж і штоквартальнікі друкуюць тэксты, прызначаныя для больш «прасунутых» успрымальнікаў.

Камэрцыйныя выданьні палююць на тое, што карыстаецца папулярнасьцю, рэйтынгавасьцю, розгаласам, і зазвычай ня маюць часу на высьвятленьне сапраўднай вартасьці падзеі ці зьявы (дзейнічае адваротны мэханізм: сама ўвага буйных СМІ надае падзеі ці зьяве вартасьць); спэцыялізаваныя часопісы намагаюцца ў меру сваіх мажлівасьцяў упарадкоўваць культурную прастору, прынамсі ствараюць пляцоўку для абмену думкамі наконт таго, што адбываецца ў культуры.

Трэба адкрыта сказаць, што літаратурныя часопісы не зьяўляюцца для камэрцыйных выданьняў сур'ёзным партнэрам, зь якім можна «рабіць бізнэс». Напрыклад, ці ёсьць з эканамічнага пункту гледжаньня хоць нейкі сэнс у тым, каб штотыднёвік з накладам у некалькі сотняў тысячаў экзэмпляраў рэклямаваўся выданьнем, якое мае ад сілы некалькі тысяч чытачоў? Таму заможныя СМІ могуць выступаць хіба што ў ролі фундатараў. Могуць, але, як бачым, ня хочуць. Ці дакладней — аддаючы належнае «Polityce», якая некалькі год таму выратавала «Res Publikę» ад заняпаду, — не зьбіраюцца рабіць гэта любой цаной. І ў час нестабільнасьці на рэклямным рынку шукаюць магчымасьці зэканоміць перш за ўсё там, дзе прыбыткі найменшыя або дзе іх наагул няма, г.зн. у сфэры культуры. Звычайная праява эканамічнай мэтазгоднасьці.

**У 90-я гады ў Польшчы зьнік як зьява грамадзка-культурны штотыднёвік, цяпер пагроза навісла над літаратурнымі і культуралягічнымі штомесячнікамі.**

## На датацыю надзеі няма

Крытык і эсэіст Кшыштаф Унілоўскі пісаў некалькі гадоў таму: «Найважнейшай зьменай у культурным жыцьці 90-х гадоў даводзіцца лічыць ня столькі нашумелае «зьнікненьне цэнзуры», колькі заняпад цэлай катэгорыі выданьняў — грамадзка-культурнага штотыднёвіка». Між тым, усё йдзе да таго, што палякаў чакае чарговая зьмена ў культурным пэйзажы — зьнікненьне літаратурных і культуралягічных штомесячнікаў.

Пра «Arkusz» і «Res Publikę» ўжо вялася гаворка вышэй. Кракаўская «Dekada Literacka» ўжо некалькі гадоў замест дванаццаці нумароў у год выдае пяць ці шэсьць, вроцлаўская «Odra» выходзіць з усё большымі затрымкамі, нават «Nowe Książki», «Twórczość» ці «Dialog», так званыя «апекаваныя часопісы», якія выдаюцца Нацыянальнай бібліятэкай на заказ польскага Міністэрства культуры, усё часьцей выпускаюць здвоеныя нумары.

У чым прычына слабасьці гэтых часопісаў? Відавочна, у фінансаваньні. З году ў год магчымасьцяў атрымаць датацыі на выданьне часопісаў робіцца ўсё менш і менш. Міністэрства культуры праводзіць у гэтай сфэры хаатычную і непрадуманую палітыку.

Па сутнасьці, ніводзін часопіс, апрача «апекаваных», ня можа быць упэўнены, ці атрымае ён у бягучым годзе датацыю міністэрства, якая гэта будзе сума і калі паступіць. Напрыклад, сёлета дагэтуль невядома, калі міністэрства выплаціць часопісам хоць нейкія сродкі. Яно дзейнічае паводле прынцыпу: вы сабе знайдзіце фінансаваньне, а мы вам, можа, калі-небудзь якую-небудзь суму і кампэнсуем.

Улады, шукаючы, дзе зэканоміць, пачынаюць са зьмяншэньня асыгнаваньняў на культуру. Пры гэтым яны схільныя ўкладаць вялікія сродкі ў буйныя, разгалінаваныя газэтныя праекты, а не ў малыя, пазбаўленыя розгаласу ініцыятывы.

Некаторыя фонды, напрыклад Фонд Сьцяпана Батуры, таксама зьмяншаюць дапамогу часопісам. Фантазіяй аказалася і надзея, што бізнэсоўцы ў Польшчы пачнуць бескарысьліва спансараваць культурныя праекты, становячыся сапраўднымі мэцэнатамі. Так робяць толькі некаторыя, а астатнія ня бачаць сэнсу ў падтрымцы якогась часопісіку з тысячай ці дзьвюма экзэмпляраў накладу, бо ад гэтага ні рэклямы, ні пашаны.

## Панаваньне газэтнага

У Польшчы ўсё яшчэ выдаецца шмат культурных і грамадзка-культурных часопісаў. Паводле зьвестак інтэрнэт-рэсурсу «Вітрына часопісаў», толькі літаратурных выданьняў там сто пяцьдзясят. Хоць многія зь іх на справе не выходзяць ці выходзяць нерэгулярна, лічба ўсё адно падаецца неблагой. Чуваць нават галасы пра перанасычэньне часопіснага рынку. Таму, маўляў, няма нічога дрэннага, калі частка выданьняў зьнікне: што зробіш, калі яны ня здольныя прыстасавацца да рыначнай рэальнасьці.

Сапраўды, многія часопісы робяцца без ідэі, яны ня маюць пэўнага профілю і выразна акрэсьленага чытача ды выдаюцца хіба для таго, каб некалькі чалавек маглі напісаць у сваёй аўтабіяграфіі, што зьяўляюцца рэдактарамі часопісаў.

Аднак у выпадку некалькіх згаданых штомесячнікаў мы маем справу са значна сур'ёзьнейшай праблемай. Сапраўды, ня мае вялікага значэньня, зьнікне часопіс X ці Y і каторы зь іх мае больш заслугаў перад польскай культурай. Але істотнай і рэальнай робіцца пагроза, што заняпад штомесячнікаў будзе азначаць зьнікненьне бадай апошняга агульнапольскага абсягу дыялёгу пра літаратуру ці культуру наагул.

А тады мы сутыкнёмся з манаполіяй інфармацыйных СМІ, што выціСьне ў нябыт цэлыя пласты культуры (паводле прынцыпу: чаго няма ў газэтах, таго няма ўвогуле). Бо такія СМІ засяроджваюць увагу перш за ўсё на вядомых асобах і гучных здарэньнях, інакш кажучы, на тым, што «добра прадаецца» і цікавіць «сярэдняга чытача».

## Марны лямант у пустэльні

Што ж рабіць? Пэўныя шанцы дае Інтэрнэт як носьбіт, таньнейшы за паперу. Можна бязь цяжкасьці перанесьці часопісы ў сетку, тым больш што пераважная іх частка мае свае інтэрнэт-старонкі. Аднак доступ да Інтэрнэту па-ранейшаму не такі лёгкі, паўсюдны і танны, каб забясьпечыць часопісам шырокую аўдыторыю.

Варта ўсё ж ратаваць часопісы, што апынуліся пад пагрозай. Няма сэнсу разьлічваць на дапамогу камэрцыйных СМІ ці «багатых дзядзечак» зь сьвету бізнэсу. Міністэрства культуры павінна спыніць свае эпізадычныя ўмяшаньні дзеля цыраваньня найбольшых дзірак і стварыць эфэктыўны, празрысты і доўгатэрміновы плян дапамогі культуралягічным часопісам. Не пашкодзілі б таксама і зьмены ў падатковым заканадаўстве, якія б заахвочвалі людзей да спансараваньня культуры.

Магчыма, варта паралельна стварыць фонд, які займаўся б пошукам сродкаў на выданьне часопісаў хоць бы на ўзроўні Эўразьвязу. Ня я першы адрасую такія прапановы людзям, адказным за палітыку ў сфэры культуры. Падазраю, што ня я буду апошні. Шкада толькі, што гэта паранейшаму марны лямант у пустэльні.

**Робэрт Асташэўскі, «Gazeta Wyborcza»**




**Робэрт Асташэўскі** — літаратурны крытык, празаік, зьвязаны з часопісамі «Dekada Literacka» і «FA-art».

# З запазухі

## Рыгор Барадулін

**Працяг. Пачатак у «НН» № 19, 21, 23, 26, 29, 31.**

Літоўскія сябры на Вышэйшых літаратурных курсах распавялі Ўладзімеру пра вясёлы выпадак зь літаратурнага жыцьця. Праўда, вясёлосьць гэная магла скончыцца жалобай.

Адразу пасьля вайны. Літва зноў далучана да савецкай імпэрыі. Зьезд пісьменьнікаў скончыў сваю каардынаваную работу. Рытуальны банкет. Парторг Саюзу пісьменьнікаў ці нехта з сакратароў ЦК агалошвае застоліцу:

— За здароўе таварыша Сталіна!

Паўза. Цішыня. І ў гэтай урачыста-змушанай цішыні дрыготкі голас старога крытыка, вядомага ў вольнай Літве, — голас з самага канца застольля, з закутку:

— А я не магу выпіць за таварыша Сталіна.

Паўза даўжэе. Цішыня наліваецца сьвінцом. Зьбялелы да халоднага поту тасьцёр, заікаючыся, пытаецца:

— А чаму Вы ня можаце выпіць за таварыша Сталіна?

— Мне не налілі…

На памянёных Вышэйшых літаратурных курсах хадзіла быліца пра савецкую пашпартызацыю. Стары інтэлігентны яўрэй атрымлівае савецкі пашпарт. Камсамолістая пашпартыстачка падае яму «сярпастымалаткасты». Разгарнуў, зірнуў ды пытаецца:

— А што гэта Вы мне напісалі ў графе нацыянальнасьць — індзей?

Пашпартыстачка баявіта:

— У Вас жа так і напісана было — індзей.

— Ды не індзей, а іудзей.

— А што гэта такое іудзей?

— Так яўрэяў называлі ў царскай Расеі.

— Усё зразумела, давайце Ваш пашпарт.

Хутка нешта чыркае й вяртае дакумэнт. Шчасьлівы ўладальнік ужо дома паглядзеў у пашпарт, а там у славутай пятай графе (яўрэяў пры саветах называлі інвалідамі пятай графы) значыцца: індзейскі яўрэй. Яшчэ адну нацыянальнасьць дадала пашпартыстка ў шматнацыянальную «сям'ю народаў», каб не перапісваць усё нанова.

Натуральна, што за Караткевічам хадзіла цэлая армія стукачоў, мастацтвазнаўцаў у цывільным. Натуральна, што Караткевіч гэта адчуваў і ведаў ды адпаведна ненавідзеў запабежнікаў з канторы глыбокага бурэньня (так шмат хто чытаў абрэвіятуру КГБ) і любіў распавядаць пацешную гісторыю, пачутую на Вышэйшых сцэнарных курсах.

Рэжысэр Юры Пыр'еў атрымаў сталінскую прэмію й быў запрошаны на прыём да «бацькі ўсіх народаў» (і не зьлічыць, колькі гэных бацькоў перажыў кожны народ). А касцюму годнага на высокі прыём у Пыр'ева няма. Выручыў адзін дужа шустры як бы прыяцель. Пашылі аб адзін дзень. Пыр'еў ідзе ў новых штах у Крэмль ды заўважае, што зашмат людзей у гэткіх жа. Пачынаецца прыём. Дужа далёка ў застольлі сьюуэціцца Сталін. Пераходзяць з аднае залі ў другую, аднолькавых касцюмаў усё болей, яны бліжэй і бліжэй падступаюцца да Сталіна, Пыр'еў зь імі. Апошняя заля. Адны аднолькавыя касцюмы. Пыр'еў чэрпае лыжкай ікру, ды тут нехта наступае яму на нагу й загадна шэпча: «Шэф сказаў на ікру не налягаць». Пыр'еву дайшло, у атэлье якога ведамства шылі яму абнову.

Калі нам здаралася замовіць на закусь ікру, Уладзімер, перш чым намазаць на лусцень колькі ікрынак, прыгаворваў: «Шэф сказаў на ікру не налягаць!»

Кажучы прыканцыляранай мовай, у нашыя маладыя гады панавала атмасфэра даверу і ўзаемапаразуменьня. Жарт і пакепліваньне, калямбурнасьць і эпіграмнасьць жылі з намі, жылі ў нас.

Не было нечаканкай (Васіль Быкаў любіў гэтае слова) атрымаць канвэрт, у якім ляжала выразка зь якога-небудзь польскага ці чэскага часопісу, дзе вядомы кінаакцёр абдымае паненку. І подпіс зьмененым (вядома ж, караткевічаўскім) почыркам: «Фальклёрных справаў майстра, згалі бараду!» Альбо прыходзіць у канвэрце паштоўка з рэпрадукцыяй карціны Лі Цы «Старшыня Мао Цзэдун на будаўніцтве Шысаньлінскага вадасховішча». Пазнатка: кітайская туш, 1958 г. На карціне вялікі кормнік правай рукой абапёрся на шуфлепадобную рыдлёўку, а левай датыкаецца да вышыванага рычыньня, які падаюць яму шчасьлівыя будаўнікі сьветлага заўтра крамлёўскага ўзору. Некалькі ў кашулях і портках, рэшта ў майках і шортах, а самы дужы з паголенай галавой нясе на каромысьле зямлю ў кашах. На адвароце паштоўкі зноў жа зьмененым почыркам: «Найвялікшаму беларускаму хунвэйбіну і маоцзэдуністу Рыгору Барадуліну зь вялікай падзякай ад яго кітайскіх пасьлядоўнікаў. Прыпадаем пад ногі твае, вялікі бахдыхан Нябеснай Імпэрыі нашай! Мао 1, Мао 2, Мао 3». Усе тры Мао ў слупок, а пасьля кожнага яшчэ, думаю, незразумелыя й для кітайцаў іерогліфы.

У свой час калекцыянаваў я этыкеткі моцных напояў з аўтографамі. Адна мне асабліва дарагая. На, як бы сказаць, тытульным баку: сталічная гарэлка, унізе: цана 2 руб. 95 кап. бяз кошту посуду. Чарнільнае кляймо: рэстаран «Нёман». На адвароце акуратна адклеенай этыкеткі знаёмым почыркам:

А за тым краем,  
Як за тым раем,  
Цяжка ўздыхаем  
І плачам.  
Яшчэ раз,  
Яшчэ раз,  
Яшчэ раз убачым.  
Бойся, урад,  
Бойся, кат,  
Яшчэ раз убачым.  
Яшчэ раз,  
Яшчэ раз  
Вернемся,  
Убачым.

Уладзімер дужа шчымліва сьпяваў гэтую песьню з часінаў паўстаньня Кастуся Каліноўскага, праўда, крыху зь іншымі словамі:

Краю наш,  
Раю наш,  
Мы цябе ня ўбачым.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

У рэдакцыі Караткевіча болей веры, болей рашучасьці, тут болей Караткевіча — нясхібнага рамантыка.

І я стараўся падбадзёрыць сябра экспромтам:

А Фама і ў вус ня дзьме —  
Быць такімі ўсім бы —  
На зямлі ён у дзярме,  
А ў бясьсьмерці зь німбам!

І экспромт гэты спраўдзіўся.

Уладзімер Караткевіч, беспартыйны беларус, які не апяваў ні заводу, ні калгасу, ня мог быць пастаўлены ў выдавецкія пляны хоць бы невялічкім зборам твораў.

Заходжу да Ўладзімера. Ён зьбіраецца ехаць на поўдзень у Дом творчасьці. У кучку скідвае мэталёвыя рублі: бальшыня з выявай цёзкі — да юбілею прамоўцы з браневіка. Уладзімер цытуе загадачку зь нейкага акцябрацкага маскоўскага часопісу:

Это что за большевик  
Там залез на броневик?  
Он простую кепку носит,  
Букву «р» не произносит.

А юбілейныя рублі Ўладзімеру патрэбныя былі не для будаўніцтва камунізму. У мінулы раз вынайшаў адменны плывец, як з мора сухім выходзіць. Калі Валянціна Браніславішна не пускала ў бліжэйшыя шалманы, сын Дняпра пераплываў заліўчык і там маладзіў душу шклянкай-другой маладога віна. Юбілейныя й неюбілейныя мэталёвыя рублі не размакалі ў кішэньцы плавак (кішэнькі ў мужчынскіх плаўках задуманыя былі для засьцярогі). Заходзіў паэта ў мора зажураны, вяртаўся вясёлы.

Потым Васіль Быкаў узгадваў, як яны адпачывалі разам у Піцундзе. Уладзімер адкрыў паселішча, дзе была добрая чача. Хадзілі, частаваліся. Грошы скончыліся. Караткевіч паехаў раней. Неўзабаве на імя Быкава прыходзіць пасылачка з познаткай: «Асьцярожна! Шкло!» Гэта Ўладзімер прыслаў пляшку каньяку, пераводам паслаў тысячу рублёў.

Зь першае старонкі кнігі зь ягоным аўтографам гаворыць утрапёнасьць і мудрасьць, балючы ўспамін і прарочы наказ: «Перасьпелае жыта плакала зярнятамі, а ў жыце стаялі шыбеніцы. І ня ўстаў ніхто, і не сказаў людзям, што няможна рэзаць адзін аднаго, што сьвет вялікі і на кожнага хопіць ніў, што хлеб аднолькава смачны, на якой мове яго ні называй. Ня мог сказаць…

Справа ішла больш чым пра хлеб. Справа ішла пра свабоду».

Перачытваю, і зноў гучыць голас, які стаўся мне родным і неабходным, спагадлівым і дарадлівым, дакорлівым і празорлівым…

### Як ловяць козаў

Пасьвіцца каза па клёньніку. Смакуе лісьцё, кару на зуб спрабуе. А воўк тым часам казу-летуценьніцу пасьвіць.

Падкрадзецца ваўчыла бліжэй, схаваецца за куст ды лясь зубамі. Каза хвост на плечы ды наўцёкі.

Бяжыць, бяжыць каза ды прыстоіць. Цікаўнасьць верне пагледзець, хто ж яе напалохаў. Тут воўк за казу ды ў лазу.

Так і ловяць козаў ваўкі.

### Зычэньні

На кожны выпадак жыцьця меліся свае пажаданьні.

Даюць сыну ці дачушцы абнову й прыгаворваюць:

— Хай носіцца, дзярэцца — на новае бярэцца! Насі й Бога прасі!

Кот мыецца, яго падахвочваюць:

— За ўхом руда, у чарапочку вада!

Заходзіць суседка ці хадыка ў хату, а гаспадыня пячэ бліны. Пажаданьне:

— Бліны з падскокам!

Калі маладзіца на часёх, жадаюць:

— Нарадзіць — як п..рдануць!

Калі госьць п'е гарэлку ці віно, нельга нічога казаць пад руку, каб ня дай Бог не папярхнуўся. Адно льга прыгаворваць:

— Мёдам на душу, патакай!

Частуючы гасьцей, гаспадары жадаюць:

— Спажывайце на здароўе!

Выходзячы з пагасьцінцаў, кажуць:

— Хай у вас будзіць нясьпіта й нязьета!

Віншаваць належыць цераз крысо кажуха, каб было багата й касмата!

І, зразумела, зь сівой паганшчыны зычэньне:

— Будзь здарова, як карова, і багата, як зямля, і пладліва, як сьвіньня!

### Беларусаў трымаюць паганскія карані

Як балтаў, як скандынаваў. Недарэмна з паганствам змагаліся й змагаюцца дасюль. Без паганскіх каранёў нацыя — пераказі-поле, народы так званыя інтэрнацыяналісты ці нават праваслаўныя атэісты.

Дык трымаюцца за ўласны тын Беларусы — кшчоныя паганцы, самаісныя, як пан бурштын.

### Купальле, Купала...

У кожным сапраўдным беларусе, у кожным паэце беларускім жыве Янка Купала як дух спаконвечнасьці, як дух богадагодлівасьці, як дух нязломістае мроі пра панавітую волю.

Шчырасьць золата вызначаецца пробай, шчырасьць беларуса, беларускасьць ягоная вызначаецца Янкам Купалам.

Купальле, Іван Купала, Янка Купала — гэта агонь.

Купальскі агонь — агонь ачышчэньня ад забыцьця сябе як крывічоў, як беларусаў. Вяртаньне душы ў беларускасьць.

Папараць-кветка — іскрынка ад купалаўскага вогнішча. Кветка, якая зорыцца праз вякі. Кветка, якую шукаюць з паганскіх часінаў, каб абнашчыць душу шчасьцем — часьцінкай сьвятла нябеснага.

Папараць-кветка Купалавага слова — іскрынка з вогнішча беларускага духу. Іскрынка, якую разьдзімаюць вятры спагады для Беларусі. Каб у цемры не блукала. Каб нашчыць Беларусь сваю душу Купалавасьцю.

Агонь Янкі Купалы мусіць гарэць у кожным беларускім сэрцы, у кожнай чыстай беларускай душы!

Каб беларусу заставацца беларусам.

Каб багацеў на зоркі беларускі космас.

Каб далячэў беларускі далягляд.

Каб меней падала зьнічак зь беларускага неба.

**Працяг будзе.**

**Торкід Гросбал**, лютэранскі пастар з Даніі, паўтарыў учынак Казімера Ляшчынскага. Сьвятар заявіў, што ні Бога, ні вечнага жыцьця, ні ўваскрашэньня няма. Біскуп Ліза-Лёта Рэбэль спачатку пазбавіла яго парафіі, але запратэставалі вернікі. Нядаўна быў дасягнут кампраміс: Гросбала вяртаюць, а той выбачаецца за тое, што пашкодзіў аўтарытэту Царквы. І застаецца пры сваіх атэістычных поглядах. Такім чынам, ён стане першым хрысьціянскім сьвятаром-атэістам. З рэзкай крытыкай такое сытуацыі выступілі прадстаўнікі каталіцкага касьцёлу.



AP

**Уладзімер Скварцоў, Уладзімер Сянько, Віктар Гайсёнак, Аляксей Скрыпка, Ігар Фісенка і Ўладзімер Герасімовіч** — беларускія паслы ў Нямеччыне, Францыі, Аўстрыі, Італіі, Бэльгіі й Нідэрляндах адпаведна — будуць атрымліваць заробак не ў далярах, як раней, а ў эўра. Так зручней. Зарабляюць дыпляматы 1800—2000 эўра ў месяц.

## «Крыніца» без Бадрова

**Уладзімер Бадроў** болей не генэральны дырэктар



IREX-PROMEDIA

«Крыніцы». Назіральная рада прадпрыемства зьняла яго з пасады. Ён быў за «Балтыку» і не спрацаваўся з аўстрыйцамі.

**Аляксандар Лукашэнка** — двойчы дзед. У малодшага сына Дзьмітрыя нарадзілася дачка. Першай ўнучцы, дачцэ Віктара Лукашэнкі, ужо пяць гадоў.

**Генэрал-маёр Юры Жадобін** з 9 верасьня адказвае за бясьпеку прэзыдэнта. Да гэтага ён камандаваў унутранымі войскамі. Паводле спэцыяльнасьці новы начальнік Лукашэнкавай службы бясьпекі — танкіст. Як і Юры Сівакоў. Неабыякая матывацыя для прызначэньня.

## Высоцкі з Чачэніяй

**Сяржук Высоцкі, лідэр ра-**



IREX-PROMEDIA

**дыкальнае Беларускае партыі свабоды,** атрымаў 10 сутак арышту за пікет салідарнасьці з Чачэніяй ля пасольства Расеі. Высоцкі на знак пратэсту абвясьціў галадоўку.

**Аляксандар І.**, маёр КДБ, 37-гадовы супрацоўнік вайсковай контрвыведкі 14-га Полацкага пагранатраду, затрыманы барысаўскімі апэратыўнікамі. Спэцслужбіст удзельнічаў у злачыннай групе, што крала дарагія іншамаркі. З аднае стаянкі ля барысаўскага «Белзьнешэканамбанку» злачынцы за паўгоду сагналі шэсьць машын. Варты нашчадак чэкістаў-экспрапрыятараў.

**36-гадовы ўраджэнец Беларусі** спрабаваў уцячы з маскоўскага СІЗА «Матросская Цішыня». Падчас прагулкі ён палез цераз агароджу, але сарваўся і «атрымаў шматлікія траўмы». Вінавацяць яго ў наўмысным забойстве.

**Гюнтэра Вальрафа**, заходненямецкага рэпарцёра, які ў 70-я стаў вядомым дзякуючы вострасацыяльным рэпартажам, вінавацяць у супрацоўніцтве з усходненямецкай «Штазі». Нібыта завэрбаваны ён быў у 1967-м і дзейнічаў пад псэўданімам «Вагнэр». Сам рэпарцёр усё адмаўляе. Халодная вайна яшчэ доўга будзе падкідаць такія сюрпрызы.

**Мэр Варшавы Лех Качыньскі** ў панядзелак прадэманстраваў, як правільна езьдзіць эскалятарам у мэтро. З 4 верасьня ў Варшаве праходзіць акцыя «Трымайся правага». Мэта — прывучыць людзей стаяць на эскалятары з правага боку. Акцыя мае і палітычны падтэкст: нешта падобнае ў праскім мэтро ладзілі напярэдадні выбараў чэскія правыя партыі.

**Азэрбайджанскі прэзыдэнт Гейдар Аліеў** невядома на якім сьвеце. Афіцыйныя крыніцы паведамляюць, што яго «арганізм пазытыўна рэагуе» на лячэньне ў Кліўлендзкай клініцы. Але ходзяць чуткі, што прэзыдэнт дажывае апошнія дні ў баракамэры, а яго атачэньне (і ў першую чаргу сын Ільхам — прэм'ер краіны) зьбіраецца хаваць сьмерць да прэзыдэнцкіх выбараў 15 кастрычніка. Мэта — выйсьці «замест бацькі» і выйграць. Паліттэхналёгія старая як сьвет.

## Дэп не патрыёт

**Актор Джоні Дэп** назваў ЗША «дурным агрэсіўным шчанюком» і сказаў, што не



WWW.ABCNEWS.GO.COM

зьбіраецца жыць у Амэрыцы, пакуль там ня зьменіцца палітычны клімат. Цяпер саракагадовы Дэп са сям'ёй жыве на поўдні Францыі. Не найгоршы варыянт дысыдэнцтва.

СМ

## ЖАРТ

Расейскія навукоўцы-абароншчыкі вынайшлі новую зброю — чыгунную бомбу. Радыюс паражэньня роўны радыюсу бомбы.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Піша вам** жаўнер Узброеных сілаў. Праз «Нашу Ніву» хачу павіншаваць сваю маму з Днём нараджэньня, які адбыўся 6 верасьня ў суботу. Печанько Сямён, Наваградак

**Віншуем Алеся Пазьняка і Міхася Шыпуля** з Днём народзінаў і Днём ведаў. Жыве Беларусь! Сябры

### ВАЗОК

**Прадам** дзіцячы вазок-кульбу (б/в, у добрым стане). Танна. Т.: 237-37-25. Алена

### КАНТАКТЫ

**Прымаю** хлопчыкаў 1990—96 г.нар. на футбол. Т.: 228-01-64. Ігар Ждан

**ЗБС «Бацькаўшчына»** запрашае на выставу дзіцячага малюнку «Беларусь. Гістарычныя вандроўкі». Адкрыцьцё 17 верасня а 16-й у Музэі Багдановіча (Траецкае прадмесьце). Выстава прысьвечаная 450-годзьдзю Рэфармацыі ў Беларусі. Пабачыць яе можна будзе цягам месяца.

**Студыя straw-дызайну** (саламаплеціва) запрашае на заняткі дзяцей, падлеткаў, моладзь (перавага ліцэістам). Т.: 250-98-67 (увечары). Аўд.308, вул.Кірава, 14

**Студэнтка МДЛУ** дапаможа зь нямецкай мовай (3 дыплёмы Рэспубліканскіх алімпіядаў, прызавая праграма Гётэ-інстытуту). Т.: 214-27-77. Ірына

**Здыму** кватэру, аднапакаёўку ў Менску (з кастрычніка). Т.: 245-84-92. Зьмітрусь

**Ружы, грэйпфруты** (з аловак таўшчынёй), фінікі (1 год), кактусы, бягоні, герань, фіялкі — танна прадам ці нават падарую. Т.: 221-21-81

**Малады Фронт**: «Моладзь за Беларусь». Т.: 211-00-00, аб.83545. www.mfront.org

**Малады фронт** запрашае ўсіх прыхільнікаў Беларушчыны. Збор шточацьвер а 19-й каля Купалаўскага тэатру

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Набуду** «Гістарычны слоўнік беларускай мовы», т.16, 17, 18. Т.: 238-80-17

**Беларускія кнігі**, аўдыё, відэа, CD, кашулькі ў Гомелі на пл.Паўстаньня штонядзелю да 13.00

**Прапануецца** альбом пінскага праекту «Полынь». 45 хвілін славянскага акустычнага фольку зь сярэднявечнай атмасфэрай. Кошт MC — 2300 рублёў, CD — 7500 рублёў.

### СПАЧУВАНЬНЕ

Сакратарыят ТБМ шчыра спачувае народнаму пісьменьніку Янку Брылю з прычыны вялікага гора — сьмерці жонкі Ніны. Пайшла з жыцьця Ваша палавінка, цудоўная жанчына, верная сяброўка, Ваша першая чытачка і крытык, надзейная спадарожніца па жыцьці. Яна заўсёды будзе жыць у памяці тых, хто яе ведаў.

А/с 20, 225710, Пінск-4. E-mail: mmaximus@tut.by

**Шукаю рэлізы** фармацый dark ambient напрамку (CMI, TESCO etc). Магчымы абмен. А/с 31, Пінск-1, 215710. E-mail: mmaximus@tut.by

**Прадаецца** «Беларуска-расейскі слоўнік» Яна Станкевіча. Т.: (у Гомелі): 45-11-51

**ZBSB.org** — сайт Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына». Т.: 289-31-94

**Olsa.by.ru** — сайт беларускай сярэднявечнай музыкі

**Набуду** 1-ы том з 4-томавага збору твораў Рыгора Барадуліна. Т.: 270-45-64

**Набуду** кнігу «Хто ёсьць хто ў Беларусі» ў апошняй рэдакцыі. Т.: 254-77-59. Аляксей

**«Кнігі — поштай» — новае:** Уладзімер Арлоў «Ордэн Белай Мышы». Замаўляйце — праз пошту: а/с 333, 220050, Менск; праз e-mail: exlibris@tut.by; праз Internet: http://exlibris.cjb.net; праз тэлефон: 8-029-643-57-33

**«Кнігі — поштай»:** больш за 120 найменьняў беларускамоўнай прадукцыі: кнігі, відэа, музыка. Замаўляйце каталёг праз пошту: а/с 333, 220050, Менск; праз e-mail: exlibris@tut.by, праз Internet: http://exlibris.cjb.net, праз тэлефон: (8-029) 643-57-33

**Фадзей Булгарын** «Выбранае» — 23-я кніга сэрыі «Беларускі кнігазбор» — ужо ў продажы

**«Беларускі кнігазбор»** — кнігі сэрыі: Берасьце — «Іскра», «Дружба», Баранавічы — «Кнігі», Горадня — «Слова», Ліда — «Кніжны сьвет», Полацак — «Сьветач», Глыбокае — «Мастацтва»

**Я.Карскі, «Беларусы»** яшчэ засталіся ў кнігарні «Кніга — XXI стагодзьдзе» (пр.Скарыны, мэтро «Маскоўская»)

**Увага!** У кнігарнях засталіся апошнія паасобнікі кніг «Беларускага кнігазбору» Янкі Купалы, І.Дамейкі

## СУР'ЁЗНА




ВАЛЯНЦІН БОЙКА

**Сябры ЗБМ «Беларускі Шлях»**
**запрашаюць на рыцарскі фэст**
у **Полацак** 13 верасьня
(субота). У вандроўку
па сярэднявечнай Польшчы:
**Торунь і Голюб—Добжынь**
19—22 верасьня.
Т.: 232-54-58, 8-029-622-57-20 (Зьміцер)

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Зьмітру Г. зь Менску.** Вашыя іранічныя сюррэалізмы — негазэтная літаратура. Аддайце ў часопіс. Напрыклад, у «Паміж».

**Андрэю М. з Горадні.** Няма сэнсу рэклямаваць напалову зроблены сайт.

**Сьвятлане М. з tut.by.** Пісаць у сярэдзіне верасьня пра ліпеньскія падзеі запозна.

**Барысу Г. зь Менску.** Матэрыял не для газэты. Найлепш ён прагучыць на якім партыйным сэмінары па абмене досьведам.

**Івану І. з mail.ru.** Скіданьне дыктатара — не канцавы прыпынак нашае гісторыі. Трэба глядзець далей.

**Дзьмітру В. з tut.by.** Праграму друкуем, бо людзі маюць права чытаць яе па-беларуску. А некалькі ўласных тэлеканалаў, якія б яны ні былі, прывучаюць людзей думаць маштабамі сваёй краіны. Прапагандысцкія ж передачы можна і не глядзець.

Зьместоўны артыкул пра тарашкевіцу знойдзеце ў часопісе «Спадчына» №5'95.

**Максіму М. з olderan.by.com.** Выдатна Вы разумееце нацыянальную ідэю! І аднадумцаў у Вас — дзясяткі тысячаў.

**Міхасю Л. зь Менску.** Навошта пра такую душэўную падзею гэтак афіцыёзна пісаць?

*Віншуем*

*Сьвятлану й Вольфа Рубінчыкаў з узяцьцем шлюбу.*

Нашаніўцы

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
галоўны рэдактар Андрэй Дынько
карэктар Сяргей Петрыкевіч
карэктарка Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.
Наклад 3404. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 01.00 10.09.2003.
Замова № 4675.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ________________

Імя і прозьвішча ________________

Адрас, тэлефон ________________